КРАСАВІК
3
ПАНЯДЗЕЛАК
1939 год
№ 16 (430)
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР



ПАЛІТБЮРО ЦК ВКП(б). Члены Палітбюро: І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. А. Жданаў, А. І. Мікаян, Н. С. Хрушчоў; кандыдаты ў члены Палітбюро: Л. П. Берыя, Н. М. Швернік.

ЗА ЎРАЧЫСТАСЦЬ КОМУНІЗМА!

Нам, шчасліваму пакаленню вялікай сталінскай эпохі, будуць зайздросціць патомкі, бо мы — сучаснікі выдатнейшай у гісторыі чалавецтва даты, сучаснікі XVIII з'езда ВКП(б), які вызначыў велічны шлях завяршэння будаўніцтва соцыялізма і паступовага пераходу к комунізму.

Слаўны шлях прайшла партыя, прайшоў совецкі народ пад сцягам комуністычнай партыі за пяць год — ад XVII да XVIII з'езда ВКП(б). І галоўны вынік пройдзенага шляху — тое, што «рабочы клас нашай краіны, знішчыўшы эксплуатацыю чалавека чалавекам і ўцвярдзіўшы соцыялістычны лад, даказаў усяму свету правату сваёй справы. У гэтым галоўны вынік, бо ён умацоўвае веру ў сілы рабочага класа і ў немінучасць яго канчатковай перамогі» (Сталін). Гэты вынік — трыумф генеральнай лініі партыі Леніна — Сталіна.

З трыбуны XVIII з'езда ВКП(б) таварыш Сталін даў совецкаму народу пабедаyносную пуцёўку да сонечных вышынь комунізма. Таварыш Молатаў з трыбуны з'езда з вычарпальнай яснасцю і паўнатой акрэсліў велічны план будаўніцтва комунізма, сталінскі план магутнага ўздыму сіл СССР, грандыёзнейшы план уздыму прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры, найвялікшага ўздыму добрабыту ў нашай краіне — план трэцяй пяцігодкі. З'езд заслухаў даклад таварыша Жданава аб зменах у Статуце ВКП(б) — даклад, які ўзбройвае партыю магутнейшай арганізацыйнай зброяй, патрэбнай для вырашэння адказнейшых задач у новую эпоху гісторыі чалавецтва — эпоху пабудовы комуністычнага грамадства.

З нябачана вялікім уздымам і актыўнасцю абмеркаваў з'езд даклады і аднадушна вынес свае гістарычныя рашэнні. З'езд зацвердзіў, як закон жыцця, як аснову ўсёй дзейнасці, барацьбы і далейшага шляху совецкага народа, даклад таварыша Сталіна — даклад, які дае совецкаму народу яснасць мэты і шляху, упэўненасць і сілу. З'езд зацвердзіў грандыёзны план трэцяй сталінскай пяцігодкі, які ператворыць нашу краіну ў краіну найвялікшага багацця, дасць магчымасць перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах у бліжэйшыя 10—15 год. З'езд прыняў са зменамі Статут партыі, які яшчэ больш умацоўвае і творча актывізіруе большэвіцкія рады, узнімае сілу і магутнасць партыі Леніна — Сталіна.

Аднадушнасць, адзінства ва ўсёй рабоце з'езда — ярчэйшае выражэнне жалезнага адзінства, маналітнасці, згуртаванасці партыі і ўсяго совецкага народа, усіх партыйных і непартыйных большэвікоў вакол ленінска-сталінскага ЦК, вакол правадыра народаў вялікага Сталіна.

Усхвалявана гучалі прамовы дэлегатаў з'езда — лепшых людзей партыі, дэлегацый працоўных рэспублік, краёў, абласцей СССР, вітаўшых з'езд з высокай трыбуны Вялікага Крэмлёўскага палаца, з якой кожнае слова чутна ўсяму свету. Іх прамовы — натхнёныя песні тварцоў соцыялізма пра славу і магутнасць маці-радзімы. З трыбуны з'езда па наказу беларускага народа прадстаўнік дэлегацыі працоўных нашай рэспублікі — народная артыстка БССР тав. Александроўская запэўніла з'езд, што Совецкая Беларусь была, ёсць і будзе баявым фарпостам соцыялізма на заходніх рубяжах нашай краіны.

Старых большэвікоў, загартаваных вопытам дзесяткаў год палітычнай дзейнасці, і сваіх маладых сыноў, вырасшых у барацьбе за соцыялізм, паслала партыя на гістарычны XVIII з'езд. Гэта — выдатны ўзор таго спалучэння старых і маладых кадраў у адным агульным аркестры кіруючай работы партыі і дзяржавы, якому вучыць нас таварыш Сталін.

Як натхняюча гучыць указанне вялікага Сталіна: «Цаніць кадры, як залаты фонд партыі і дзяржавы, даражыць імі, мець да іх павагу». З бацькоўскай цеплынёй і любоўю гаварыў з трыбуны з'езда правадыр аб вырасшай у нас новай, народнай, соцыялістычнай інтэлігенцыі, заклікаў клапатліва выхоўваць яе, узбройваць яе вайстрэйшай зброяй барацьбы за комунізм — марксізмам-ленінізмам, навукай аб законах развіцця грамадства.

І ў адзіным парыве ўся партыя, увесь народ натхнёна апладыравалі мудрым словам, якія акрэсліваюць грандыёзнасць уздыму культуры ў перыяд пераходу к комунізму, ускладаюць новыя пачэснейшыя абавязкі на совецкую інтэлігенцыю, — словам таварыша Сталіна: «Мы хочам зрабіць усіх рабочых і ўсіх сялян культурнымі і адукаванымі і мы зробім гэта з цягам часу».

Якая чаруюча-велічная задача! І якія пачэснейшыя абавязкі ўскладае партыя на совецкую інтэлігенцыю і, у прыватнасці, на слаўны атрад яе — на тварцоў літаратуры і мастацтва—па вырашэнню задачы комуністычнага выхавання працоўных — асноўнай умовы пабедаyноснага руху к комунізму.

Вырашэнне гэтай задачы — напісанне выдатных твораў пра вялікую сталінскую эпоху і пра лепшых людзей яе—тварцоў соцыялізма. Гэтыя творы павінны наносіць руйнуючыя ўдары перажыткам капіталізма ў свядомасці людзей, павінны трапна, насмерць, біць ворагаў, павінны ўмацоўваць мабілізацыйную, баявую гатоўнасць совецкага народа, умацоўваць нашу соцыялістычную дзяржаву. Гэтыя творы павінны паказаць ва ўсёй велічы геній Леніна, геній Сталіна — тварцоў шчаслівай будучыні чалавецтва. Гэтыя творы павінны вучыць, выхоўваць, натхняць мільёны будаўнікоў комунізма. І з'езд ўзбройвае на вырашэнне гэтай гістарычнай задачы совецкіх літаратараў і мастакоў. Матэрыялы з'езда—невычэрпная крыніца творчага натхнення і творчай працы.

Цудоўнай сілай паэзіі славіць веліч спраў партыі Леніна — Сталіна, узнімаць благародныя пачуцці совецкага патрыятызма. Вострай сатырай выкрываць паклёпнікаў, перастрахоўшчыкаў, кар'ерыстаў. Мечам большэвіцкага слова знішчаць ворагаў партыі і народа. Мастацкім словам, сцэнічным вобразам, кісцю мастака, пяром кампазітара — усімі сіламі і сродкамі соцыялістычнага мастацтва ўмацоўваць магутнасць совецкага народа, змагацца за комунізм. Вось — свяшчэнныя абавязкі майстраў літаратуры, майстраў мастацтва перад партыяй, перад радзімай.

Упэўнена ідучы да зяючых вышынь комунізма совецкі народ ні на хвіліну не павінен забываць сталінскае ўказанне аб капіталістычным акружэнні, помніць сталінскі наказ: усямерна ўмацоўваць магутнасць нашай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Чырвонага Флота.

Лепшыя людзі арміі — прадстаўнікі нашага мірнага народа, выкаваўшага лепшую і магутнейшую ў свеце армію, з трыбуны з'езда з новай сілай заявілі аб баявой гатоўнасці, жалезным адзінстве і загартаванасці арміі соцыялізма, аб бязмежнай адданасці яе справе Леніна — Сталіна. Грозным, суровым напамінам для раз'юшаных фашысцкіх драпежнікаў, якія ў дзікай ненажэрнасці шыраць полымя другой імперыялістычнай вайны, прагучала прамова Наркома абароны маршала Совецкага Саюза Клімента Ефрэмавіча Варашылава. Гора тым, хто не ўлічыць гэтага грознага напаміну! У нашых руках выпрабаваная ўсемагутная зброя марксізма-ленінізма, да нас з надзеяй і любоўю працягваюць рукі пролетарыі і прыгнечаныя ўсяго свету, нас вядзе геній чалавецтва, тварэц перамог і шчасця таварыш Сталін. Наш народ і наша армія — магутная, адзіная, непераможная сіла. І яны — народ і армія — горда і проста заяўляюць усяму свету словамі вялікага Сталіна: «Мы не баімся пагроз з боку агрэсараў і гатовы адказаць двайным ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны, якія спрабуюць парушыць недатыкальнасць Совецкіх граніц».

Дні, калі ў Вялікім Крэмлёўскім палацы працаваў XVIII з'езд, былі днямі нябачанага ўсенароднага ўздыму, днямі дэманстрацыі баявой гатоўнасці і адзінства нашых радоў, днямі выдатнейшага спаборніцтва за дасягненне новых поспехаў соцыялістычнай працы. Сцяг гэтага спаборніцтва стаў сцягам барацьбы за выкананне планаў трэцяй пяцігодкі. Сцяг трэцяй сталінскай пяцігодкі высока ўзнят стосямідзесяцімільённым совецкім народам.

Няспыннае ўмацаванне партыі, умацаванне соцыялістычнай дзяржавы, бязлітасная выкарчоўка варожых элементаў, непахіснае маральна-палітычнае адзінства совецкага народа — зарука паспяховага будаўніцтва комунізма. Рашэнні XVIII з'езда ВКП(б) — наша ўсёперамагаючая зброя.

Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)!

Няхай жыве тварэц комунізма — наш правадыр і настаўнік, наш родны Сталін!

ЯК ЛЕНІН І СТАЛІН ЛЕПШАЕ ЖЫЦЦЁ НАМ ДАЛІ

(Беларускі сказ).

Радзіўся я ў беднай хаце, насіў латку на лаце. Даводзілася яшчэ змалку цярпець то бізун, то палку. Куды-б ты ні пайшоў, усюды цябе пан знайшоў: на карак табе садзіцца, п'е, гуляе і весяліцца. Ды дзе ты дзенешся ад паноў, калі ходзіш без сарочкі і штаноў?

Прыляцела ленінскае слова, як звязда: «Увесь народ, слухай сюды: вось прыйшоў прыгнёту канец—упаў з Міколкі вянец; вянец разбіўся, а Міколка скруціўся».

Тут поп народ хацеў крутнуць, завярнуць, але яму няўдача, бо ў яго барада казляча. Хадзіў, хадзіў поп з крапілам, дурыў, дурыў, — ды дудкі: кідай, доўгагрывы, свае шуткі. Бяры, баця, за ручку сваю маладзіцу, ды ўцякай за граніцу.

Як ні думай, пан пузаты, не вярнуцца табе ў палаты. Для нас воля, а па табе плача таполя. Пятлюра збег у лес, Дзянікіна схапіў бес, а Махно—баран аддаў шкуру на барабан.

І цяпер настаў шчаслівы час. Мудрым правадыром быў Ленін у нас. Ленін нам шлях паказаў. Мы ленінскім шляхам пайшлі — лепшую долю знайшлі. Для нас лепшымі бацькамі сталі мудрыя правадыры Ленін і Сталін. Няма ў свеце лепшай рады, як совецкая ўлада. Любы нам ленінскі шлях, багатырскі Сталіна размах. Мы жывём, весялімся, ідзём працаваць у калгас, — песня звініць сярод нас. Вечарам у клубе музыка, танцы, — гуляй, весяліся, братцы.

Сталін наш дужы, як дуб на прыволлі, не дасць пасмяяцца над намі ніколі. Хай фашысты бесяцца: аб нашы пагранічныя парогі паломяць яны сабе рогі. А калі працягнуць лапу, альбо высунуць храпу, —з іх рылаў аблавухіх пацячэ гнілая юха.

Запісаў **Н. Я. Ермак** ад каваля **А. А. Бузно,** 54 год, у калгасе «Чырвоны баец» Рэчыцкага раёна.

СКАЗ ПРА СТАЛІНА

Не вярба шуміць, ды не бор пяе,
Не саловушка залівaецца —
Гэта песні звіняць, ды пра шчасцейка,
Ды пра шчасцейка, што нам
Сталін даў.
Ох, і жысць была, ды бязвокая...
А цяпер кругом, ды навокала
Ясны зоры Масквы так і свецяцца.
Нашы дзеванькі, ды калгасныя
На вялікіх людзей навучаюцца,
У Вярхоўны Совет выбіраюцца.
А вясковыя хлопцы нашыя
У небе лётаюць—ажно страх глядзець.
Паглядзіш у даль—поле-шыр ляжыць,
Трактары на іх—ух!—гудзяць, гудзяць.
А жняяркі там, як сарокі трашчаць.
Як сыр-бор—жыты каласістыя,
Бель-пшаніца кругом, ды зярністая,
Развялікія льны размаўляюцца,
Размаўляюцца, усміхаюцца.
Багатыр-калгас—сям'я дружная,
Ды і дружная і багатая:
Запрашае сыноў-пагранічнікаў.
Нашы вёскі былі, як ноч, цёмныя,
А цяперака азарыліся,
Ясным сонейкам асвяціліся.
Ды не простае гэта сонейка—
Гэта Сталін наш—ясны свет, зара—
Асвяціў з Крэмля цемру вечную.
Дзе балоты былі, ды зыбучыя,
Дзе лясы былі, ды драмучыя,
Там дарога лягла, ды жалезная,
І шырокая, як струна—прама.
Ды не простая то дарожанька—
Гэта ленінскі большэвіцкі пуць,
Па каторым вядзе Сталін родны наш
У шчаслівае жыццё светлае.
Знае ён усе нашы думанькі:
Канстытуцыю сваю Сталінскую
Напісаў ён рукой сваёй ленінскай.
Як садоўнік ён даглядае сад.
А не сад цвіце — ўсе рэспублікі.
Толькі ворагі люду чэснага
З-пад ілба глядзяць, ды завідуюць,
Клыкі точаць свае, ды свінячыя,
Рылы сунуць свае, задзіраюцца.
Але мы ўжо не баімся іх:
За нас Сталін стаіць, а мы ўсе разам
з ім.
Як адзін пастаім за шчаслівую жысць,
За шчаслівую жысць, што нам
Сталін даў.

Запісалі **С. В. Турчыновіч** і **І. І. Сіняўскі** ад калгасніцы **М. Янкевіч** у арцелі імя Літвінава, Рэчыцкага раёна.

Цімох КРЫСЬКО

СЫНУ

Гляджу ў твае чыстыя вочы
І сэрца імклівае хоча,
Каб вырас ты смелым, сумленным,
Дастойным свайго пакалення;

Каб ззялі і позірк, і слова
Усюды яснотай крыштальнай,
Каб шчыра бярог і ахоўваў
Ты імя заветнае — Сталін.

Любою дарогай-пуцінай
Ідзі, мой сынок, па радзіме,
Не ты сваю долю шукаеш,—
Яна цябе кліча, гукае.

Як стромкае свежае дрэўца
Да сонца тугімі лістамі,
Імкніся заўсёды ты сэрцам
Да светлага імені — Сталін.

Ніколі, ніколі, мой сыне,
Ён ў крыўду не дасць, не пакіне:
І радасць падзеліць з табою,
І ў горы агорне душою.

Народжаны шчасным прадвеснем,
Вітай-жа травінкаю весняй,
Пралескаю цёплых прагалін,
Як словам сардэчнае песні
Імя любімае — Сталін.

Сакавік, 1939.

XX год Маскоўскага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра

СЛАЎНЫ ЮБІЛЯР

31 сакавіка совецкая грамадскасць адзначала XX-годдзе існавання Маскоўскага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.

Рост і развіццё гэтага тэатра быў магчым толькі ў нашай краіне, таму што партыя Леніна — Сталіна і совецкі ўрад стварылі ўсе ўмовы і па-бацькоўску штодня клапаціліся аб росквіце культуры народаў СССР, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Маскоўскі яўрэйскі тэатр на працягу ўсяго свайго творчага шляху змагаўся за рэалістычнае мастацтва. На яго сцэне ўпершыню правільна загучалі творы яўрэйскіх класікаў — Шолам-Алэйхема, Мендэля Мойхер-Сфорым, І. Л. Перэца, якія апавядалі аб бяспраўным і прыгнечаным жыцці працоўных яўрэяў у царскай Расіі.

У рэпертуары гэтага-ж тэатра багата п'ес яўрэйскіх совецкіх драматургаў, у якіх адлюстроўваецца шчаслівае жыццё роўнаправных грамадзян СССР—яўрэяў, якія разам з усімі народамі Совецкага Саюза актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве. Рад гістарычных п'ес праўдзіва раскрываюць старонкі мінулага яўрэйскага народа. Такія пісьменнікі, як П. Маркіш, С. Галкін, Д. Бергельсон, І. Дабрушын, М. Даніэль, Орлянд — напісалі для тэатра рад п'ес і разам з ім раслі і ўдасканальвалі сваё літаратурнае майстэрства.

Яўрэйскі тэатр паставіў выдатны спектакль В. Шэкспіра «Кароль Лір», сцэнічная трактоўка якога была настолькі свежай і новай, што гэтым спектаклем, па сутнасці, пачаўся новы этап творчага жыцця тэатра і ўнесен вялікі ўклад ва ўсё развіццё совецкага тэатральнага мастацтва.

Імя народнага артыста СССР С. М. Міхоэлса вядома ўсяму совецкаму народу. Ён стварыў рад хвалюючых вобразаў, нямала паставіў цікавых спектакляў і як мастацкі кіраўнік правільна арыентыраваў тэатр, вёў яго па шляху рэалізма.

Шмат запамінаючыхся ролей, як камедыйнага, так і драматычнага плана, стварыў на сцэне гэтага татра народны артыст РСФСР В. Л. Зускін.

За дваццаць год у Маскоўскім Дзяржаўным яўрэйскім тэатры выраслі здольныя артысты —Штэйман, Гетнер, Шыдло, Фінкелькраут і інш.

На святкаванне юбілея тэатра ў Маскву выехала дэлегацыя работнікаў мастацтваў і пісьменнікаў БССР у складзе тт. Аксельрода, Э. Кагана, В. Вольскага, заслужанай артысткі рэспублікі Аронсык, артысткі Дрэйзінай і мастака Кінкіс.

МАСКВА, ГОСЕТУ

ЖАДАЕМ ДАЛЕЙШЫХ ПОСПЕХАЎ

Горача вітаем выдатны Маскоўскі яўрэйскі тэатр з 20-годдзем. Жадаем далейшых поспехаў і росквіту яўрэйскага совецкага мастацтва.

Братняе прывітанне таленавітаму калектыву тэатра.

Праўленне Саюза Совецкіх пісьменнікаў БССР.

Прысваенне С. Міхоэлсу звання народнага артыста СССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 31 сакавіка 1939 года мастацкаму кіраўніку Маскоўскага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра Саламону Міхайлавічу **Міхоэлсу** прысвоена званне народнага артыста СССР. (ТАСС).

УЗНАГАРОДЖАННЕ РАБОТНІКАЎ МАСКОЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРА

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 31 сакавіка 1939 года за выдатныя заслугі ў развіцці совецкага тэатральнага мастацтва ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі 18 работнікаў Маскоўскага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.

Ордэнам Леніна ўзнагароджан **Міхоэлс** Саламон Міхайлавіч — народны артыст РСФСР.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны: **Зускін** Веніямін **Львовіч** — заслужаны артыст РСФСР, **Пульвер Леў** Міхайлавіч — заслужаны дзеяч мастацтваў, **Штэйман** Міхаіл Давыдавіч — заслужаны артыст РСФСР.

Ордэнам «Знак почета» ўзнагароджаны 10 чалавек.

Медалью «За трудовое отличие» ўзнагароджаны 4 чалавекі.



«Генеральны консул» Л. Шэйніна і бр. Тур у Менскім Белдзярждрамтэатры. На здымку: фінал спектакля. Злева направа: Гоглідзе—засл. арт. БССР Б. В. Платонаў, Сіма — засл. арт. БССР І. Ф. Ждановіч, Марозаў — засл. арт. БССР Л. Г. Рахленка, Закір—арт. В. А. Краўцоў, Жукаў—арт. П. А. Пекур.

Фотахроніка БЕЛТА.

НЕЗАБЫЎНЫ ДЗЕНЬ

Я шчаслівая тым, што мяне паслалі ў складзе дэлегацыі вітаць XVIII з'езд партыі большэвікоў. Але яшчэ больш ганаруся аказаным мне вялікім гонарам выступаць ад імя працоўных БССР у Крэмлі перад лепшымі людзьмі нашай краіны, перад ленінска-сталінскім Цэнтральным Камітэтам, перад горача любімым Іосіфам Вісарыёнавічам Сталіным.

Тое ні з чым не параўнанае радаснае хваляванне, якое ахапіла мяне, калі тав. Панамарэнка сказаў, што вітаць з'езд буду я, не пакідае мяне і сёння. З усведамленнем вялікай адказнасці пачала я рыхтавацца да выступлення. Незвычайную чуласць і клопаты праяўлялі да мяне ўсе нашы дэлегаты. Кожны паасобку і ўсе разам перажывалі, хваляваліся са мною, жадаючы парадай, адносінамі, увагай дапамагчы мне найлепш падрыхтаваць сваё выступленне. Асабіста тав. Панамарэнка ўдзяліў мне шмат часу, разам са мною правяраючы і ўдасканальваючы тэкст прамовы. Гэта таварыскае, сяброўскае падтрыманне ўсяго калектыва дало мне шмат сіл, упэўненасці і жадання апраўдаць аказанае давер'е. І таму, калі таварыш Сталін і таварыш Варашылаў сказалі, што добра было-б пачуць прывітанне на беларускай мове, я знайшла ў сабе столькі ўпэўненасці, што не задумваючыся прадаўжала прывітанне па-беларуску, хоць яно і было падрыхтавана мною на рускай мове.

З'езд вельмі цёпла, доўгімі апладысментамі сустрэў нашу дэлегацыю. Доўга не змаўкалі воклічы ў гонар таварыша Сталіна. Гэта была дэманстрацыя вялікай шматнацыянальнай дружнай сям'і, з'еднанай адной воляй, адным агульным жаданнем, адной мэтай — жыць і працаваць на карысць народа, на карысць завяршэння будаўніцтва комунізма. З'езд вельмі ўважліва слухаў усё прывітанне, а тыя месцы, дзе гаварылася аб перадавіках нашай сельскай гаспадаркі — аб трактарысту тав. Бохану, камбайнеру тав. Гараўцову, звеннявой калгаса «1 Мая» тав. Фалькінай, аб стаханаўцах — ліцейшчыку тав. Перагуду, кляпальшчыку тав. Ярашэвічу, столяру тав. Іванову, лесарубу тав. Гоціну, аб звяне жанчын-лесарубаў (брыгадзір тав. Буй), — з'езд і асабіста таварыш Сталін віталі асабліва горача.

Цяжка перадаць тыя мыслі, тое шчаслівае хваляванне, якое ахапіла мяне і ўсіх нас пры ўсведамленні, што мы знаходзімся ў Крэмлі, на самай высокай вяршыні свету, што з крэмлёўскіх вышынь, асветленых рубінавымі зорамі комунізма, бачым мы радасны, прыгожы сёнешні дзень нашай радзімы, бачым яе лепшых прадстаўнікоў, бачым і чуем таварыша Сталіна—сцяг вызваленай працы, сцяг светлага і шчаслівага жыцця.

У сваім дакладзе таварыш Сталін гаварыў, што, як яркі рэзультат другой пяцігодкі, вырасла ў совецкай краіне новая, соцыялістычная інтэлігенцыя, выйшаўшая з народа, непарыўна звязаная з народам, гатовая аддаць усе свае сілы і жыццё за ўзняцце культуры народа, за яго далейшы росквіт. Самы факт, што ад імя працоўных БССР з'езд вітала я, — найлепшая ілюстрацыя да гэтай часткі даклада таварыша Сталіна. Бязмежныя клопаты аб нас, аб нашым росце, аб умовах, якія спрыялі-б развіццю нашых талентаў, аб беражлівых і ўважлівых адносінах да нас з боку партыі і ўрада мы адчуваем штодзённа.

Удумлівымі, сур'ёзнымі адносінамі да сваёй работы, выдатнымі, вартымі эпохі Сталіна спектаклямі, найлепшымі вытворчымі паказчыкамі, умацаваннем соцыялістычнай дысцыпліны працы, натхнёныя вялікімі ідэямі комунізма, адкажам мы партыі і ўраду за іх клопаты аб нас.

У нашых пачуццях і мыслях заўсёды жыве светлы вобраз вялікага Сталіна, лепшага друга беларускага народа, які ўсяляе ў нас непахісную ўпэўненасць у нашых перамогах.

Можна з упэўненасцю сказаць, што сталінская эпоха ўвойдзе ў гісторыю, як эпоха ўзнікнення новага мастацтва, мастацтва, якое адлюстроўвае велічную карціну будаўніцтва соцыялізма.

Маё прабыванне ў Крэмлі, гонар вітаць XVIII з'езд, ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт і роднага, любімага Сталіна, — на ўсё жыццё застанецца ў мяне ў памяці, яшчэ больш натхняючы мяне на выкананне задач, пастаўленых прада мною ў справе развіцця мастацтва БССР.

Няхай жыве натхніцель нашых перамог, наш мудры настаўнік і друг таварыш Сталін!

Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ,
Народная артыстка БССР.

УМАЦАВАННЕ КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫХ ТЭАТРАЎ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР вызначыла рад мерапрыемстваў па далейшаму росту і ўмацаванню калгасна-соўгасных тэатраў рэспублікі. Для падрыхтоўкі кадраў калгасна-соўгасных тэатраў кантынгент аднагадовых курсаў пры тэатральным вучылішчы будзе павялічан з 28 да 60 чалавек. Арганізуюцца кароткатэрміновыя курсы па павышэнню кваліфікацыі дырэктароў і адміністратараў тэатраў. Распрацаван план і прыкладны календар вучобы актораў.

На працягу бягучага года ў кожны калгасна-соўгасны тэатр будзе паслана па аднаму рэжысёру з рэспубліканскіх тэатраў для ажыццяўлення чарговай пастаноўкі. Прымаюцца меры для забеспячэння тэатраў аўтобусамі, перасоўнымі дынамамашынамі. Для забеспячэння тэатраў касцюмамі, парыкамі, рэквізітам і бутафорыяй у Менску арганізуюцца цэнтральныя майстэрні. Гэтыя-ж майстэрні будуць рыхтаваць тэхнічныя кадры для калгасна-соўгасных тэатраў.

Для азнаямлення грамадскасці БССР з работай калгасна-соўгасных тэатраў у Менску з 4 па 16 мая арганізуецца фестываль. Кожнаму тэатру даручана падрыхтаваць для паказу на фестывалі па дзве пастаноўкі. У дапамогу ім будуць накіраваны, у парадку шэфства, работнікі рэспубліканскіх тэатраў.

Колькасць калгасна-соўгасных тэатраў будзе павялічана. Адзін тэатр будзе арганізаван яшчэ ў бягучым годзе ў Рэчыцы, чатыры — у іншых раёнах. Такім чынам колькасць калгасна-соўгасных тэатраў вырасце з 6 да 11.

В. П.

Соцыялістычнае спаборніцтва калектываў самадзейнасці

13 лютага бягучага года хор калгаса імя Літвінава (Рэчыцкага раёна) пад кіраваннем калгасніцы Лапіцінай выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і дэкады беларускага мастацтва ў Маскве самадзейны калектыў Хойніцкай МТС. Умовы спаборніцтва: асваенне раду новых беларускіх песень і танцаў, а таксама песень і танцаў народаў братніх рэспублік, выезды ў калгасы, арганізацыя ў калгасах новых гурткоў самадзейнасці і г. д. Узятыя на сябе абавязацельствы калектывы самадзейнасці выконваюць паспяхова.

Самадзейны калектыў Хойніцкай МТС за месяц 9 разоў выязджаў у калгасы раёна, арганізаваў тры новых калгасных самадзейных гурткі, вывучыў новы танец «Падушачка», 12 новых песень, склаў частушкі, прысвечаныя XVIII з'езду ВКП(б) і Чырвонай Арміі. Калектыў Хойніцкай МТС збірае беларускі фальклор і рыхтуе да выступлення на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы рад новых песень і танцаў.

Хор калгаса імя Літвінава таксама выязджаў у калгасы раёна, а зараз папаўняе сваю праграму танцавальнымі нумарамі.

Калгасны фестываль музыкі

З 1 чэрвеня па 13 ліпеня 1939 года будзе праведзен калгасны фестываль музыкі, прысвечаны XIX гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў. Лепшыя артыстычныя сілы Тэатра оперы і балета, Філармоніі, Кансерваторыі, музвучылішчаў, а таксама пісьменнікі, кампазітары выедуць у раёны БССР і прадэманстрыруюць перад калгасным гледачом дасягненні беларускай культуры, класічнага і совецкага беларускага мастацтва. Рад канцэртаў будзе дадзен для дзяцей калгаснікаў.

20 год Магілеўскай музычнай школы

25 сакавіка бягучага года споўнілася 20 год з дня арганізацыі музычнай школы ў гор. Магілеве. За 20 год музычная школа выхавала вялікую колькасць артыстаў і музыкантаў, якія займаюць зараз ганаровыя пасады ў музычных установах і арганізацыях не толькі ў БССР, але і ў Маскве, Ленінградзе і іншых гарадах СССР (салістка Вялікага Акадэмічнага тэатра Талахадзе, асістэнт Маскоўскай кансерваторыі — кандыдат музычных навук Гінзбург і інш.).

Апрача выхавання маладых музычных кадраў, школа вядзе вялікую работу па папулярызацыі і прапагандзе сярод працоўных Магілеўскай вобласці лепшых узораў класічнага і совецкага музыкальнага мастацтва.

Школа мае многа кваліфікаваных і адданых справе педагогаў. Сярод іх — заснавальнік школы і яе дырэктар, настаўнік па духавых і народных інструментах Л. М. Зісман, які працуе ў школе 20 год без перапынку; настаўніца па класу фортэп'яна І. Л. Меркіна, якая працуе ў гэтай школе 19 год; настаўнік па класу скрыпкі А. Ф. Еўстратаў і настаўнік па класу віяланчэлі Л. І. Юшкевіч, якія працуюць ў Магілеўскай музшколе па 17 год, і іншыя.

Пастановай Упраўлення па справах мастацтваў і Магілеўскага горсовета юбілей школы будзе адсвяткаван 7 красавіка. Да юбілея школа рыхтуе рад творчых справаздач-канцэртаў.



З выстаўкі «Індустрыя соцыялізма». Карціна Д. А. Налбандзян: «Таварышы І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў і С. М. Кіраў на Беламорска-Балтыйскім канале».

Фотахроніка ТАСС.

НА УСЕСАЮЗНАЙ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎЦЫ „ІНДУСТРЫЯ СОЦЫЯЛІЗМА“

Гэта—выключная па свайму значэнню выстаўка. Мастацкімі вобразамі расказвае яна гераічную гісторыю маладой соцыялістычнай індустрыі, гісторыю творчых дзярзанняў і радасцей совецкага народа, гісторыю будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне.

У першым, уступным, аддзеле выстаўкі перад намі ўстаюць карціны праклятага мінулага. Мастакі Кукрыніксы выставілі тры выдатныя па сваёй выразнасці палатны: «Малебен на закладцы фабрыкі», «Катастрофа на шахце» і «Бегства фабрыканта». Гэта амаль трыпціх, які раскрывае перад гледачом дзікасць і тупасць капіталізма, жахі капіталістычнай эксплоатацыі і жалкую баязлівасць буржуа перад наступаючай рэволюцыяй. Таленавіты мастак Б. В. Іогансон выставіў карціну «Урал Дэмідаўскі». Гэта работа Іогансона, як і нашумеўшая ў свой час яго карціна «Допыт комуністаў», вылучаецца вялікім жывапісным майстэрствам і драматызмам зместу. З работ, прысвечаных грамадзянскай вайне, вылучаецца карціна Ф. І. Невежына «Брат—здраднік».

Шырока ілюстрыраваны галоўныя аддзелы выстаўкі, прысвечаныя будаўніцтву совецкай індустрыі і яе выдатным людзям. Тут заслугоўваюць быць адзначанымі карціны В. П. Ефанава і В. Н. Якаўлева. Карціны «Незабыўнае» і «Старацелі пішуць пісьмо таварышу Сталіну» гавораць аб далейшым творчым росце гэтых таленавітых майстроў кісці. На шматлікіх палотнах паказаны прамысловыя нова-будоўлі і прадпрыемствы: Днепрагэс, Краматорскі завод, Березнікоўскі хімкамбінат і інш.

Шмат работ у гэтых аддзелах прысвечана С. Орджанікідзе і лепшым людзям соцыялістычнай працы — ордэнаносцам. Вылучаецца па замыслу карціна Ф. А. Мадорава «Сталевар Мазай выступае з прамовай на Надзвычайным VIII з'ездзе Советаў». За сталом прэзідыума таварышы Сталін, Молатаў, Орджанікідзе, якія вітаюць славутага ордэнаносца.

З работ на калгасныя тэмы заслугоўваюць быць адзначанымі карціны С. В. Герасімава і А. А. Пластова на тэму «Свята ў калгасе».

Багата прадстаўлен аддзел сатыры. Кукрыніксы далі рад вострых сатыр на злобадзённыя тэмы. Прыцягвае ўвагу карыкатура «Казяўка і Слон», якая высмейвае фашысцкіх вар'ятаў, што мараць далучыць Совецкую Украіну да казяўкі—Прыкарпацкай Украіны. Як заўсёды, дасціпны сатырычныя работы М. Б. Храпкоўскага.

Скульптура прадстаўлена работамі С. Д. Меркурава, М. Г. Манізера, якія выставілі монументальныя скульптуры таварышоў Леніна і Сталіна. Добрыя таксама работы скульптараў О. Д. Яноўскай, Д. П. Шварца і Л. А. Гаспар'яна.

Прыемна адзначыць, што на гэтай выключнай па свайму значэнню выстаўцы побач з мастакамі іншых рэспублік удзельнічаюць і мастакі Совецкай Беларусі. Мастакі Л. М. Лейтман і І. О. Ахрэмчык выставілі акварэльныя работы на індустрыяльныя беларускія тэмы, мастак Н. А. Пашкевіч выставіў жанравую карціну «На прагулцы». Заслужаны дзеяч мастацтваў Грубэ прадстаўлен вырэзанай з вялікага дубовага ствала скульптурай «Трактарыстка».

Усяго на выстаўцы «Індустрыя соцыялізма» паказваецца звыш 1.200 работ. У выстаўцы ўдзельнічае звыш 600 мастакоў Совецкага Саюза. Выстаўка карыстаецца ў масквічоў вялікім поспехам.

А. ДАЛІН.

Масква. **(Наш. спецкар.)**

ПОЎВЕКА НА СЦЕНЕ

24 сакавіка ленінградская грамадскасць урачыста адзначыла 50-годдзе творчай дзейнасці і 45-годдзе бесперапыннай работы ў Дзяржаўным чырвонасцяжным Акадэмічным тэатры драмы імя А. С. Пушкіна народнага артыста Саюза ССР ордэнаносца Юрыя Міхайлавіча Юр'ева.

Звыш 250 ролей сыграў юбіляр. 110 ролей сыграна ў класічным рэпертуары. Юрый Міхайлавіч сыграў 17 ролей у п'есах Шэкспіра, 13 ролей у п'есах Астроўскага. З выключнай энергіяй артыст працаваў і зараз працуе над сцэнічным увасабленнем вобразаў совецкай драматургіі.

Н. ЗЕЛЕНОЎ

Н. В. ГОГАЛЬ

(Да 130-годдзя з дня нараджэння)

Творчы геній Гогаля фарміраваўся ў цяжкіх умовах наступіўшай пасля разгрому дзекабрыстаў нікалаеўскай рэакцыі.

Н. В. Гогаль з'яўляецца прадаўжальнікам пушкінскіх традыцый у рускай літаратуры. Не мала агульных матываў знойдзем мы ў творчасці Пушкіна і Гогаля, Пушкін сам падказаў Гогалю рад тэм і сюжэтаў.

Першым друкаваным творам Гогаля з'яўляецца напісаная яшчэ ў 1827 годзе і надрукаваная ў 1829 годзе паэма ў вершах «Ганс Кюхельгартэн». На ёй відаць выразныя сляды моцнага ўплыву байранаўскіх і рамантычных традыцый у рускай літаратуры. Гэта паэма, не гледзячы на ўсю яе няспеласць, характарызуе Гогаля як чалавека, які не мірыцца з прыгонніцкай рэчаіснасцю.

Паэма не мела поспеху. Яе сурова раскрытыкавалі. Сам Гогаль знішчыў гэты твор.

Уся наступная творчасць Гогаля сведчыць аб тым, наколькі нянавісным было для пісьменніка прыгонніцтва з усёй яго чыноўніцка-бюракратычнай сістэмай.

Следам за «Гансам Кюхельгартэнам» паявілася ў друку ў 1830—31 годзе серыя апавяданняў з жыцця украінскага народа. Гэтыя апавяданні Гогаль выдаў зборнікам пад назвай «Вечары на хутары блізу Дзіканькі». Гогаль карыстаецца тут формай сказу, павестваванне вядзе не ад свайго імя, а ад імя зямца Панькі Рудога. Гогаль захоўвае ў павестваванні асаблівасці мовы апавядальніка.

Зборнік «Вечароў» авеян рамантыкай. Пры дапамозе рамантычных прыёмаў пісьма Гогаль рысаваў гераічныя вобразы народа. Усе гэтыя матывы асабліва моцна выяўлены ў аповесці «Страшная помста». Рамантыкай авеян вобраз казака Данілы і яго прыяцеляў. Гогаль паказаў высокія душэўныя якасці народа: адданасць радзіме, нянавісць да ворагаў радзімы, да здраднікаў. Гогаль паказаў у народзе мужнасць, здольнасць на гераізм, здольнасць памерці за радзіму.

Следам за «Вечарамі» у 1835 годзе вышаў зборнік «Міргарад». У гэты зборнік Гогаль уключыў 4 аповесці: «Тарас Бульба», «Вій», «Старасвецкія памешчыкі», «Аповесць аб тым, як пасварыўся Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам».

Аповесць «Тарас Бульба» па свайму зместу і мастацкіх прыёмах блізка прымыкае да зборніка «Вечароў» і асабліва да аповесці «Страшная помста».

Абедзве аповесці, «Страшная помста» і «Тарас Бульба», паявіліся ў выніку глыбокага вывучэння Гогалем жыцця і паэзіі украінскага народа. Не з памешчыцкага класа, а з нетраў самога народа ўзяў Гогаль станоўчыя вобразы казака Данілы з «Страшнай помсты», Тараса Бульбы і яго сына Астапа з аповесці «Тарас Бульба».


У двух другіх аповесцях — «Старасвецкія памешчыкі» і «Аповесць аб тым, як пасварыўся Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам» Гогаль у значнай меры мяняе свой метад пісьма і карыстаецца пераважна метадам крытычнага рэалізма. Перад чытачом выступаюць вобразы вельмі абмежаваных у сваіх культурных патрабаваннях памешчыкаў — Афанасія Іванавіча і Пульхерыі Іванаўны з аповесці «Старасвецкія памешчыкі», Івана Іванавіча і Івана Нікіфаравіча з аповесці аб двух Іванах.

Следам за зборнікам «Міргарад» Гогаль друкуе серыю пецярбургскіх аповесцей («Неўскі праспект», «Партрэт», «Шынель», «Запіскі звар'яцелага», «Нос»). Работа над гэтымі аповесцямі прыпадае на перыяд паміж 1833—1842 гадамі.

У «Запісках звар'яцелага» Гогаль ад імя героя аповесці Папрышчына пісаў аб соцыяльных супярэчнасцях вялікага горада. «Усе просяць лепшага на свеце, усё дастаецца ці камер-юнкерам, ці генералам».

Свет галечы, соцыяльнай забітасці і бяспраўя адкрыўся вялікаму мастаку ў пецярбургскіх кварталах. І пад гэтым светам узнімалася бяздушная, асуджаная Гогалем чыноўніцка-бюракратычная сістэма.

У цэнтры ўвагі ў гэтых аповесцях у Гогаля стаіць паказ трагедыі асобы, якая гіне ў цісках пошласці, бяздушнасці, меркантылізма. Гіне дробны чыноўнік Башмачкін у аповесці «Шынель», гіне дробны чыноўнік Папрышчын у «Запісках звар'яцелага», гіне мастак Піскароў у «Неўскім праспекце», безнадзейна загубіў сябе і свой талент мастак Чарткоў у аповесці «Партрэт».



Н. В. Гогаль.

Як гуманіст, Гогаль паказаў у пакрыўджаных лёсам людзях жывую чалавечую душу. Ён убачыў чалавека ў Акакію Акакіевічу Башмачкіну, у гэтым бяспраўным і забітым дробным чыноўніку. Чалавека ўбачыў ён і ў дробным чыноўніку Папрышчыну, так пакутліва перажываўшым соцыяльныя супярэчнасці і не знайшоўшым сабе месца ў жыцці. Чалавека ён паказаў і ў мастаку Піскарову, які не прымірыўся з пошласцю жыцця і скончыў жыццё самагубствам. Чалавека паказаў ён і ў мастаку Чарткову, калі ён яшчэ быў бедным. Калі-ж Чарткоў здрадзіў мастацтву ў пагоні за багаццем, Гогаль яго асудзіў.

Адначасова з работай над «Пецярбургскімі аповесцямі» Гогаль працаваў над п'есамі «Жаніцьба» і «Рэвізор».

Камедыя «Жаніцьба»—па свайму зместу ў многіх адносінах «предвосхищает» творчасць Остроўскага. Тут паказан быт і жыццё купецкага асяроддзя, даюцца тыпы купцоў і чыноўніцтва.

Выкрыццю прадажнасці і гніласці быту чыноўніцтва прысвечана камедыя «Рэвізор». У пісьме к Жукоўскаму (21 студзеня 1848 года) Гогаль пісаў, што ў гэтай камедыі ён сабраў усё адмоўнае і смешнае, што было ў рускай рэчаіснасці, каб «за адным разам над усім пасмяяцца». Гогаль рысаваў у гэтай камедыі, галоўным чынам, правінцыяльнае чыноўніцтва. Але ў камедыі мы бачым велізарную сілу абагульнення. За вобразамі правінцыяльных чыноўнікаў вырысоўвалася ўся прыгонніцкая Расія з усім яе чыноўніцка-бюракратычным апаратам. Гогаль паказаў гранічную ступень грабежніцтва, крадзяжу, хабарніцтва і машэнніцтва, да якога дайшлі чыноўнікі паказанага ў камедыі правінцыяльнага гарадка. Гогаль паказаў і бяспраўе народа, цалкам аддадзенага ва ўладу чыноўніцкаму сваволлю.

Калі камедыя паявілася ў друку, яна выклікала злую крытыку з боку рэакцыйнага лагеру. У новым выданні камедыі Гогаль адказаў на гэта выццё крытыкаў эпіграфам: «На люстра няма чаго наракаць, калі морда крывая».

«Мёртвыя душы» з'яўляюцца апошнім творам Гогаля. Над «Мёртвымі душамі» Гогаль працаваў з 1835 года і да апошніх дзён свайго жыцця. Першы том выйшаў у 1842 годзе. Гогаль меў намер напісаць «Мёртвыя душы» у трох томах накшталт «Бажэственай камедыі» Дантэ. Загаловак «Мёртвыя душы» з'яўляецца сімвалічным. Гогаль у сваім творы даў разгорнутую галерэю «мёртвых душ» у асобе Сабакевічаў, Паздровых, Плюшкіных і іншых.

Гогаль нібы раз'язджае разам з Чычыкавым па розных памешчыцкіх маёнтках. Такая кампазіцыя поўнасцю адпавядала гогалеўскаму замыслу даць шматлікую партрэтную галерэю памешчыкаў і чыноўніцтва.

Перад чытачом праходзяць машэннік і аферыст Чычыкаў, зверападобны Сабакевіч, тупавумная скапідомка Каробачка, чуллівы і пошлы лятуценнік Маніла́ў, прарэха на чалавецтве — скупы Плюшкін, скандаліст Паздроў, які вечна тулядецца па кірмашах і прапівае рэшткі сваёй гаспадаркі.

Але Гогаль у «Мёртвых душах» паказвае не толькі памешчыцка-чыноўніцкае грамадства. Ён паказвае і жыццё народа. Гогаль мысліў напісаць эпапею аб рускім народзе. Гэты замысел знайшоў сваё выражэнне і ў вызначэнні самім Гогалем жанру твора. Гогаль назваў «Мёртвыя душы» паэмай. Ён паказаў цяжкае жыццё прыгоннага сялянства, паказаў галечу і разарэнне сялянства.

Гогаль у «Мёртвых душах» паказаў, што народ валодае выключным багаццем душэўных якасцей.

Народная Русь рысавалася пісьменніку ў выглядзе шпаркай тройкі, якую «змайстраваў і сабраў... яраслаўскі дасціпны мужык» і перад якой «староняцца і даюць ёй дарогу іншыя народы і дзяржавы».

Аднак, Гогаль тварыў у тую эпоху, калі народ быў яшчэ палітычна няспелым і непадрыхтаваным да рэволюцыйнай барацьбы. Гэта перашкодзіла Гогалю ўзняцца да рэволюцыйных вывадаў у сваёй творчасці ў цэлым і ў «Мёртвых душах» у прыватнасці. Справа ў тым, што Гогаль невымоўна пакутваў ад раздзіраючых яго душу сумненняў і соцыяльных супярэчнасцей.

У пошуках вырашэння ўсіх мучыўшых яго сумненняў, Гогаль зусім правільна звярнуўся за адказам к народу. Але народ, сам замучаны прыгонніцтвам, у масе сваёй няграматны, палітычна яшчэ няспелы, патрыярхальны, не здолеў у той час даць Гогалю правільнага адказу на мучыўшыя яго пытанні. Усё гэта рабіла творчасць Гогаля супярэчлівай. У гэтых супярэчнасцях Гогаля выяўляліся супярэчнасці яго эпохі.

Бяссілле вырашыць соцыяльныя супярэчнасці штурхнула Гогаля ў містыку, у папоўшчыну. Выражэннем гэтага папоўства ў «Мёртвых душах» і з'явіўся вобраз Муразава ў другім томе «Мёртвых душ». Адыход у містыку і папоўшчыну прымушаў Гогаля аглядвацца назад. У самых патрыярхальных умовах мінулага і сучаснага Гогалю прыгоннага жыцця пісьменнік спрабаваў знайсці вырашэнне ўсіх соцыяльных пытанняў.

Выражэннем усіх гэтых настрояў Гогаля і з'яўляецца вобраз Кастанжогла ў «Мёртвых душах».

У крытыцы ўстанавілася традыцыйная думка, што вобраз Кастанжогла нібы нерэальны, немастацкі, надуманы. Але гэта не так. Такіх людзей было не мала ў эпоху Гогаля.

У вобразе Кастанжогла Гогаль сцвярджаў ідэю аб гуманных адносінах памешчыкаў да сялян. Але ў той-жа час у вобразе Кастанжогла даецца выявіліся і рэакцыйныя тэндэнцыі Гогаля супроцьпаставіць надыходзячым новым, больш прагрэсіўным формам буржуазнага ладу дакапіталістычны патрыярхальны ўклад.

Вобразы Кастанжогла і Муразава тым самым з'яўляюцца ілюстрацыяй слабых бакоў гогалеўскага рэалізма.

Адначасова з работай над «Мёртвымі душамі» Гогаль напісаў рэакцыйную кнігу «Выбраныя месцы з перапіскі з прыяцелямі». Сурова асудзіў гэту кнігу вялікі крытык Белінскі ў сваім «Пісьме к Гогалю». В. І. Ленін высока ацаніў «Пісьмо к Гогалю» Белінскага. Нам няма патрэбы закрываць вочы на слабыя рэакцыйныя бакі творчасці Гогаля. Трэба толькі правільна зразумець прычыны гэтых рэакцыйных тэндэнцый у Гогаля, рабіўшых яго творчасць вельмі супярэчлівай.

Бяссмертныя вобразы Гогаля аказаліся на службе ў рэволюцыі. На працягу ўсяго развіцця рэволюцыйнага руху ў Расіі вобразы Гогаля выконвалі гэту пачэсную ролю. Гэтыя вобразы Гогаля аказаліся на службе ў вялікіх геніяў чалавецтва В. І. Леніна і І. В. Сталіна ў іх барацьбе супроць ворагаў партыі, супроць ворагаў працоўных мас. Яшчэ не так даўно, на VIII з'ездзе Советаў, вобраз гогалеўскай Пелагеі быў выкарыстан І. В. Сталіным у дакладзе аб праекце новай Совецкай Канстытуцыі і накіраван па адрасу некаторых крытыкаў нашай Канстытуцыі з польскіх і часткова амерыканскіх газет.

Тав. Жданаў у сваім дакладзе «Змяненні ў статуце ВКП(б)» на XVIII з'ездзе ВКП(б) таксама выкарыстаў гогалеўскі вобраз Сабакевіча для характарыстыкі паклёпнікаў, якія ў сваіх варожых мэтах шальмуюць чэсных людзей.

«У сувязі з Аляксеевым, — гаварыў тав. Жданаў,—я думаў, каго нагадвае такі тып, і мне ўспомніўся Сабакевіч з аповесці Гогаля «Мёртвыя душы». Сабакевіч, як вядома, усіх лічыў машэннікамі і разбойнікамі. Калі Чычыкаў прызнаўся Сабакевічу, што яму больш за ўсіх у губернскім горадзе падабаецца паліцмейстар за прамату і прастасардэчнасць, Сабакевіч хладнакроўна адказаў:

«Машэннік! Прадасць, ашукае, яшчэ і паабедае з вамі! Я іх ведаю ўсіх: гэта ўсё машэннікі, увесь горад там такі: машэннік на машэнніку сядзіць і машэннікам паганяе. Усе хрыстапрадаўцы. Адзін там толькі ёсць парадачны чалавек: пракурор; ды і той, калі сказаць праўду, свіння».

Спадчыну Гогаля высока цэняць працоўныя масы Совецкага Саюза. Імя Гогаля карыстаецца ў нашай краіне пашанай і любоўю.

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ОПЕРА

„Міхась Падгорны“

Опера Е. К. Цікоцкага «Міхась Падгорны» з'яўляецца першай ластаўкай у справе стварэння беларускай нацыянальнай оперы і балета, першым веснікам таго, што беларускі народ у гісторыі развіцця сваёй музычнай культуры адкрывае новую старонку. Гэта старонка патрабавала велізарнай працы і з боку кампазітара і з боку тэатра, патрабавала напружанай барацьбы з ворагамі народа, якія імкнуліся калі не знішчыць, дык затрымаць стварэнне гэтага твора. Не глядзячы на перашкоды ворагаў, «Міхась Падгорны» атрымаўся спектаклем, вартым увагі опернага слухача.

Музычная мова оперы вельмі выразная і зразумелая нават радавому слухачу. Вялікая заслуга кампазітара ў тым, што ён здолеў добра выкарыстаць фальклорныя багацці беларускага народа. Народная песня атрымала ў оперы права дзеючай асобы, ад чаго твор у цэлым толькі выйграў. Беларускія танцы ў першай карціне, вясельныя абрадавыя песні ў другой, хоры ў трэцяй і іншых карцінах надаюць оперы неабходную цеплыню і добра дапамагаюць раскрываць сюжэтныя лініі твора. Музычныя характарыстыкі галоўных дзеючых асоб (Марысі. Міхася, Ганкі, Анішчука і інш.) у аснове сваёй маюць таксама элементы народнай песні, што робіць іх (дзеючых асоб) вельмі жыццёвымі.

Вялікае ўражанне пакідае арыя Марысі ў другой карціне, пабудаваная на беларускай народнай песні. Ды і ўвесь вобраз Марысі абмаляван кампазітарам вельмі задушэўна, праўдзіва.

Цікава адзначыць, што лейтматывы кампазітарам выкарыстоўваюцца не толькі ў якасці музычнай характарыстыкі дзеючых асоб, але і як матэрыял для абрысоўкі драматычных сітуацый. Так, напрыклад, лейтматыў Міхася паяўляецца ў часе чыткі Марысяй пісьма з фронта; Міхась праз сваю музычную характарыстыку як-бы нябачна прысутнічае ў гэты момант на сцэне. Вобраз Міхася Падгорнага, эмацыянальна насычаны, трогацельны ў момантах лірычнага парадку (1-я карціна, 3-я, канец 5-й), губляе сваю праўдзівасць у момантах сутыкнення з кулацкімі элементамі вёскі, у момантах ператварэння Міхася ў байца-рэвалюцыянера. Тут вінаваты і лібрэта, і рэжысура, і сам кампазітар. Міхась, як рэвалюцыянер. не займае вядучай ролі і калі выступае самастойна (напрыклад, у сцэне на фронце), дык толькі ў памерах музыкальнага рэчытатыву, а не ў форме арыі, як гэта даручана бальшэвіку-падпольшчыку Анішчуку. Сутычкі Міхася з Зміцраком сцэнічна мала пераканаўчыя, Міхась вялы і бездапаможны ў другой карціне, яго паяўленне на вяселлі Марысі мала праўдападобна, а расправа яго з Зміцраком у апошняй карціне з'яўляецца больш вынікам асабістых адчуванняў (адказ на замах Зміцрака на жыццё Марысі), чым пераканаппем бальшэвіка-рэвалюцыянера. Як бальшэвік, ён мог прыйсці да гэтага вываду яшчэ на фронце. Музычная характарыстыка Міхася ў апошніх трох карцінах, нажаль, засталася няпэўнай і нявыраснай. Прынцып лейтматыўнасці ў гэтым выпадку сваёй статычнасцю знізіў вобраз Міхася.

Гэтай-жа памылцы падвергнуўся і лейтматыў кулацкай сям'і Закрэўскіх. Гэта тэма — важкая, гарманічна ўпругая, засталася нязменнай на працягу ўсёй оперы, а мы ведаем, што кулакі ў барацьбе з рэвалюцыяй мянялі сваю фізіяномію ад зверападобнай да «ангельскай», мянялі сваю тактыку ад прамой контррэвалюцыі да метадаў «ціхай сапай». Ды і сцэнічна адмоўныя тыпы оперы дадзены мала пераканаўча, у іх многа трафарэтнага «зладзейства», з імі неяк надзвычай лёгка змагацца, яны больш махаюць кулакамі, больш пагражаюць, чым дзейнічаюць.

Удала абмаляван кампазітарам вобраз бальшэвіка Анішчука. Яго музыкальны матэрыял (асабліва арыя ў 4-й карціне) вылучаецца сваёй яркасцю, сілай і мэтаімкнёнасцю.

Гэтай-жа мэтаімкнёнасцю, непахіснай верай у перамогу народа прасякнута ўся музыкальная канва оперы, асабліва гэта падкрэсліваецца кампазітарам у вялікім сімфанічным уступе да чацвертай карціны, малюючай ператварэнне вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую, і дасягае сваёй кульмінацыі ў песні салдатаў (4-я карціна) і ў фінальнай песні (6-я карціна).

Кампазітар добра карыстаецца фарбамі сімфанічнага аркестра. Суправаджэнне дапамагае правільнаму разуменню музычнага зместу оперы. Наяўнасць вакальных ансамбляў (секстэт у 1-м акце, дуэт і трыо) надае оперы пэўную каштоўнасць; гэта ўзмацняецца яшчэ і таму, што большасць савецкіх оперных кампазітараў пазбягаюць у сваёй творчасці ансамбляў такога тыпу. Хоры оперы (асабліва пабудаваныя на фальклорным матэрыяле) таксама робяць добрае ўражанне сваёй музыкальнасцю і змястоўнасцю, за выключэннем хора параненых салдатаў у другой карціне. Гэта карціна, дарэчы, не апраўдваецца ні зместам, ні месцам драматургічнай дзеі, — атрымаліся нейкія «калики-перехожие», бязвольныя і слязлівыя, ніяк не падобныя на тых салдатаў, якія «нагамі» актыўна галасавалі за спыненне імперыялістычнай вайны. Уражанне непатрэбнасці пакідае і пачатак шостай карціны (сцэна дзяляжу зямлі), дзе не зразумееш, з-за чаго-ж, урэшце, спрачаюцца мужыкі: з-за двух дрэваў на сцэне, ці з-за права першынства неўпапад выступіць са сваёй рэплікай.

«Міхась Падгорны», не глядзячы на сваю бясспрэчную музычную каштоўнасць, мае безумоўную патрэбу ў дапрацоўцы па лініі ўзмацнення праўдзівасці драматычных сітуацый і сцэнічнага іх увасаблення.

Лібрэта, не глядзячы на сваю мастацкую значымасць і паэтычнасць у тэкставой сваёй частцы, мае патрэбу ў разгрузцы дзеі (асабліва ў 6-й карціне), у давядзенні да канца некаторых вобразаў (напрыклад, Ганкі), у шліфоўцы і ўзмацненні асобных сувязей паміж драматычнымі момантамі (прыклад — недастатковая апраўданасць сцэны дзеляжу зямлі).

«Міхась Падгорны» безумоўна заслугоўвае таго, каб у дапрацаваным выглядзе паказаць яго, як поўнакаштоўны мастацкі твор, на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

У заключэнне трэба адзначыць, што акустыка новага тэатра прымушае жадаць шмат лепшага. Аркестровая шчыліна і глыбокая і вузкая, ад чаго шмат што ў аркестровым гучанні не даходзіць да вуха слухача, твор ад гэтага шмат страчвае, а няведаючых слухачоў уводзіць у заблуджэнне, прымушаючы іх думаць аб нядобраякаснасці аркестроўкі партытуры, аб слабасці галасоў артыстаў і г. д.

Пастаноўка ў Дзяржаўным оперным тэатры ў дні гістарычнага XVIII з'езда ВКП(б) першай беларускай оперы—факт велізарнай важнасці, які сведчыць аб тым, што беларускае мастацтва знаходзіцца на высокім узроўні развіцця, што беларускія творчыя сілы знаходзяцца на такім уздыме, які магчым толькі ў рэзультаце перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

П. ПАДКАВЫРАЎ.

Актары і вобразы

Першую беларускую оперу «Міхась Падгорны» нельга яшчэ разглядаць, як закончаны музыкальна-драматычны твор. Як з новага будынка, з яе нават не паспелі зняць рыштаванняў. Яшчэ патрэбна ўзмацніць драматургічную лінію лібрэта, узбагаціць музыку, пазбавіць іх непатрэбных длінот і нядзейсных эпізодаў. Асабліва многа павінна быць зроблена ў галіне грунтоўнага паляпшэння рэжысёрскай інтэрпрэтацыі оперы. Хочацца адчуць больш цеплыні, святла ў дэкарацыях і менш музейнай стылізацыі і пейзанства ў касцюмах.

Зразумела, што будзе заўчасным пісаць зараз аб выкананні партый, аб асобных сцэнічных вобразах, як аб чымсьці закончаным. І ў гэтай галіне яшчэ значная работа наперадзе. Але і ўжо дасягнута шмат цікавага і карыснага.

Лірычнае абаянне паэзіі П. Броўкі і музыкі Е. Цікоцкага лепш за ўсё адчуваецца ў партыі Марысі. Унутраная тэма Марысі — душэўныя пакуты сумленнай дзяўчыны, у якой адбываецца барацьба паміж пачуццём шчырага кахання да Міхася і рэлігійным абавязкам перад Зміцраком. Душэўная драма беднай дзяўчыны разгортваецца на шырокім сацыяльна-палітычным фоне нарастання рэвалюцыйных падзей.

Лейттэма Марысі, яе арыі і дуэты. меладычныя рэчытатывы з Міхасём, Ганкай і Закрэўскім — увасабляюць ідэю перамогі шчырага пачуцця над рэлігійным абавязкам.

Літаратурны і музыкальны каларыт партыі Марысі больш лірычны, чым драматычны. Сумныя лірычныя інтанацыі пранізваюць усю музыкальную тканіну партыі. Эмоцыі жыццёрадаснасці ў светаадчуванні дзяўчыны выяўлены вельмі цьмяна.

Уся музыкальна-драматургічная структура партыі яшчэ недасканалая, хоць Марыся, бадай, найбольш цэльная і, нам здаецца, найбольш выразная і ў нацыянальным каларыце партыя оперы. У ёй менш традыцыйнай опернасці, чым у любой іншай партыі. Выканальніцай гэтай партыі з'яўляецца народная артыстка БССР Л. П. Александроўская. Л. П. Александроўская ўдала спалучае чароўны голас з велізарным сцэнічным дараваннем.

Л. П. Александроўская — артыстка з натхнёным тэмпераментам. Яна ўзбагаціла партыю сваёй яркай артыстычнай індывідуальнасцю і тонкім пачуццём каларыту.

У пранікнёным выкананні Л. П. Александроўскай Марыся — абагулены тып беднай сялянскай дзяўчыны, глыбокія пакуты і пачуцці якой хвалююць сваім драматызмам і чалавечнасцю. Л. П. Александроўская таленавіта ўвасобіла сацыяльна-тыповыя рысы вобраза і непаўторныя індывідуальныя ўласцівасці Марысі.

З выключнай лірычнай цеплынёй і мяккасцю выканана артысткай арыя Марысі ў другім акце, у якім душэўная драма дзяўчыны дасягае найбольшага напружання. Вобраз Марысі, створаны Л. П. Александроўскай, — радасная падзея ў савецкім оперным мастацтве

Менш радуе артыст В. Ф. Лапін у партыі Міхася. Мы не маем падстаў для нездаволенасці музыкальным рысункам партыі Міхася і вакальным майстэрствам артыста. Голас яго, цёплы і прыемны па тэмбру, аднолькава добра гучыць ва ўсіх рэгістрах. Але сцэнічны рысунак вобраза не здавальняе. Штосьці ў ім ад оперных трафарэтаў, ад традыцыйнага выканання партыі Ленскага. Гэта часам адчуваецца ў рухах, жэстах і ў мізансцэнах. Нават касцюм Міхася яшчэ не асвоен і не абыгран Лапіным.

Разрыў паміж зместам партыі і сцэнічным рысункам вобраза, нажаль, існуе. Мы ўпэўнены, што цэнтральны герой оперы «Міхась Падгорны» можа загучаць са сцэны з належнай мастацкай сілай. Артыст В. Ф. Лапін валодае ўсімі якасцямі, неабходнымі для выканання гэтай задачы. Лібрэтыст і кампазітар павінны дапамагчы тэатру ўзмацненнем музыкальна-драматычнай выразнасці партыі.

Опернага шаблона не пазбаўлена і выкананне артысткай Т. Я. Хумаравай партыі Ганкі. У першай арыі Ганкі ёсць драматызм, задушэўнасць і сапраўдныя перажыванні пакрыўджанай лёсам салдаткі. Рад драматургічна цікавых сітуацый для Ганкі ёсць ва ўсёй оперы, яны даюць магчымасць стварыць цікавы вобраз; але, з прычыны сцэнічнай невыразнасці выканання гэтай партыі, вобраз Ганкі ў спектаклі па-сапраўднаму не адчуваецца.

Больш радасных хвілін даставіў слухачам прэм'еры заслужаны артыст рэспублікі І. Я. Мурамцаў — Анішчук.

Добры вакаліст, І. Мурамцаў багата папрацаваў і над сцэнічным увасабленнем вобраза падпольнага бальшэвіка. І Мурамцаў знайшоў многа цёплых і шчырых інтанацый, якія робяць вобраз Анішчука надзвычай чалавечным і прывабным. Нажаль, асноўная арыя Анішчука (4 акт) не гучыць належным чынам. У гэтым менш за ўсё вінават артыст: выдатна напісаная П. Броўкам арыя не знайшла, на нашу думку, належнай музыкальнай інтэрпрэтацыі ў оперы. Вакальны рысунак арыі ніжэй за літаратурны тэкст.

Артыст Д. М. Салохін праўдзіва раскрыў строй думак і пачуццяў Зміцрака Закрэўскага, — яго грубасць, тупасць і бяздушнасць. Злітнасць вакальнага і сцэнічнага рысунка партыі забяспечылі артысту творчую ўдачу.

Незразумела, чаму ў оперы прапаршчык Агрызка страціў камедыйны каларыт, які яму ўласцівы па лібрэта. Відаць, з гэтай прычыны і вобраз Агрызка (заслужаны артыст рэспублікі І. Р. Балоцін) страціў у спектаклі свой індывідуальны каларыт.

Вельмі шкада, што здольнаму артысту трапіла не зусім удалая партыя.

Радуе артыстка Ц. І. Мільчына ў характэрнай партыі бабы-лапатухі. Мільчына знайшла выразны вакальны і сцэнічны рысунак для вобраза пляткаркі. Здзіўляе толькі знешняе ўбранне «лапатухі». Занадта яно прэтэнцыёзнае і музейнае.

Сцэнічная культура адчуваецца і ў выкананні эпізадычнай партыі Марціна артыстам П. І. Засецкім.

Нашы заўвагі аб некаторых актарах і вобразах — вынік толькі першага ўражання ад праслухання оперы. Мы ўпэўнены, што ў працэсе дапрацоўкі, паляпшэння оперы ўзбагацяцца і асобныя партыі, і сцэнічнае выкананне ў спектаклі ўзнімецца на значна большую мастацкую вышыню.

М. МОДЭЛЬ.



«Міхась Падгорны». Сцэна «Расказ аб Леніне». Анішчук—засл. арт. БССР І. А. Мурамцаў. Міхась—арт. В. Ф. Лапін. Фота І. Каплінскага.



«Міхась Падгорны». Сцэна «Раненне Ганкі». Ганка — арт. Т. Я. Хумарава, Марыся—засл. арт. БССР Р. В. Млодэк. Фота І. Каплінскага.

Абмеркаванне оперы „Міхась Падгорны“

Клубны вечар у Доме пісьменніка 20 сакавіка быў прысвечан абмеркаванню прэм'еры оперы «Міхась Падгорны».

Уступнае слова сказаў пастаноўшчык оперы заслужаны артыст рэспублікі Л. М. Літвінаў. Ён адзначыў станоўчыя якасці оперы, вялікі творчы поспех аўтара-кампазітара Е. К. Цікоцкага і ўказаў на неабходнасць дапрацоўкі лібрэта, перапрацоўкі афармлення оперы.

Падрабязна спыніўся на характарыстыцы музыкі оперы кампазітар Н. Н. Шчэглоў, адзначыўшы багацце і яркасць яе, насычанасць фальклорам. Па думцы тав. Шчэглова, тэатр разам з аўтарамі оперы павінен дапрацаваць і больш акрэсліць цэнтральныя вобразы — Міхася, Анішчука. Патрэбна больш ярка паказаць аптымізм і сілу народа. Патрабуюць перапрацоўкі пастаноўка танцаў, якія пазбаўлены народнасці, і мастацкае афармленне

Станоўчую ацэнку даў тав. Шчэглоў выканаўцам галоўных партый.

Тав. Я. Маўр выказаў пажаданне, каб тэатр, працуючы над павышэннем мастацкіх якасцей оперы, пазбавіўся ад празмернай расцягнутасці оперы, загружанасці сюжэта і больш акрэсліў цэнтральныя вобразы. Аб неабходнасці дапрацоўкі оперы гаварыў і тав. А. Шарапаў.

Рэзка крытыкаваў афармленне оперы, зробленае Б. А. Матруніным, мастак Алтуф'еў.

Для больш шырокага абмеркавання оперы пісьменнікамі, акторамі і работнікамі мастацтваў вырашана прысвяціць ёй яшчэ адзін з бліжэйшых клубных вечароў.

А. Б.

А. ЕСАКОЎ

ТАЛЕНАВІТАЯ П'ЕСА

Тэма аб дыверсантах і іх выкрыцці стала ўсё часцей і глыбей цікавіць савецкіх пісьменнікаў. І гэта не выпадкова. Само жыццё падказала гэту тэму, падзеі апошніх год прымусілі пісьменнікаў узяцца за распрацоўку багатага матэрыялу ліквідацыі розных антысавецкіх банд, якія імкнуліся рэстаўрыраваць капіталізм у нашай радаснай краіне сацыялізма. Аднак, тэма гэта не такая лёгкая, як здавалася некаторым драматургам, і ў драматургічным нарысе яе наўрад ці можна глыбока вырашыць. Захапляючы матэрыял драматургі іншы раз выкарыстоўвалі для п'ес вонкавага дзеяння, не паглыбляючыся ў распрацоўку характараў дзеючых асоб, а механічна падганяючы падзеі пад інтрыгу, пад гатовы сюжэт, які часта базіраваліся на некалькіх фактах з практыкі савецкай разведкі.

У п'есе «Пагібель воўка» * Э. Л. Самуйлёнак выходным пунктам узяў не асобныя факты, не выпадковых людзей, а жыццё ўсяго савецкага народа і здолеў апраўдаць пагібель ворагаў нашай краіны, ворагаў народа заканамернасцю развіцця сацыялістычнага грамадства. Ён саміх ворагаў прымусіў прызнаць нашу сілу, а справамі дзеючых асоб паказаў, як савецкі народ выкрывае антысавецкіх мярзаўцаў, што прысасваюцца да здаровага савецкага арганізма.

Драматург проста, але ясна паказаў, што варожыя лазутчыкі — гэта агідныя выраджэнцы, якія ў пагоні за ўласным дабрабытам згубілі ўсе чалавечыя рысы і дзейнічаюць канібальскімі метадамі. Эд. Самуйлёнак на прыкладзе жыцця аднаго прыгранічнага калгаса паказвае ўвесь размах, усю веліч сацыялізма, які ўвайшоў у быт і звычаі людзей калгаснай вёскі. Аўтар не ўпрыгожвае гэта складанае і багатае жыццё, а як пісьменнік-рэаліст апавядае аб ім усхвалявана, праўдзіва і скромна, а дзе трэба і пафасна. Эд. Самуйлёнак шчыра любіць савецкую рэчаіснасць і страсна ненавідзіць ачмурэлых фашысцкіх шакалаў, што выскаляюць зубы на нашу зямлю.

Простым, на першы погляд, здаецца сюжэт п'есы. Быццам сёння вы прыехалі ў прыгранічны калгас і вам расказалі, што шпіён суседняй неразумнай дзяржавы перайшоў на наш бок, сустрэўся са сваімі падручнымі, даў ім дыверсійныя заданні, а сам пры дапамозе ворагаў, якія акапаліся ў раёне, накіраваўся ўглыб краіны. Пільныя вартавыя нашых граніц—пагранічнікі і іх памочнікі—калгаснікі і вясковая інтэлігенцыя вылавілі бандытаў.

Мы ведаем Эд. Самуйлёнка як майстра сюжэтных твораў, які пры добрым веданні жыцця насычаў літаратурную форму глыбокім зместам. У яго творах дзейнічаюць сапраўдныя людзі, з ярка акрэсленымі характарамі і пэўнымі паводзінамі. Лепш за ўсё можна прасачыць гэта на п'есе «Пагібель воўка».

Людзі з варожага стану напісаны аўтарам досыць складана, ярка і чотка. Ваўкі, пагібель якіх у нашай краіне непазбежна, дзейнічаюць кожны па-свойму. Адсюль у кожнага свой характар, свае звычкі, свой склад розуму, у кожнага ворага свой метад работы. Гэта робіць вобразы шкоднікаў надзвычай разнастайнымі.

Закляты і хітры вораг, сапраўдны звер — ляснік Харкевіч. Ён хітра прыстасоўваецца к акружаючаму асяроддзю, хутка мяняе тактыку дзеянняў. Але ўпэўненасці ў сваёй справе ён не адчувае. За ўсёй яго хітрасцю прыкмячаецца няшчырасць, нейкая цьмяная таямнічасць, падазроная замкнутасць, што прымусіла нават дачку яго Насцю западозрыць бацьку ў злачынстве. Злаба Харкевіча іншы раз прарываецца звонку і выдае яго з галавой. Гэта фігура з лісічым характарам страшэнна складаная і каб зразумець яе, трэба добра вывучыць яе варожыя ўчынкі, прааналізіраваць яе дзейнасць, знайсці нітку і раскруціць клубок злачынстваў Харкевіча.

Для абрысоўкі другой групы ворагаў аўтар абраў сродкі сатыры. Сапраўшы з гэтых ворагаў адзенне савецкіх людзей, драматург паказаў аблічча маральна разлажыўшыхся кар'ерыстаў, п'яніц, тупіц, фашысцкіх служак.

Старшыня РВК Абабурка пачынае сваю дыверсійную дзейнасць з таго, што імкнецца заблытаць справу аб атручанні конскага маладняка і абвінавачвае ў гэтым чэснага загадчыка конефермай Лук'яна Рабічку. Майстэрска напісана аўтарам сцэна замятання слядоў трацкісцкай дзейнасці Абабуркі. Драматург войстрым сарказмам, які даходзіць да гратэску, высмейвае спалоханасць ворага перад выкрыццём савецкай разведкай асінага гнязда, якое звілі сабе ворагі ў адным з раёнаў БССР. І нарэшце, нікчэмнасць гэтага чалавека больш за ўсё відна ў апошняй сцэне, дзе маральнае аблічча разнузданага ворага высвятляецца канчаткова.

Некалькімі выразнымі штрыхамі рысуе драматург агіднага нацыянал-фашысцкага паэта Шышку, які з-за п'янства не бачыць свету, піша махровыя контррэвалюцыйныя «вершы». Дзейнічае ён мала, але добра характарызуе сабою пэўную групу дыверсантаў, якія шмат шкодзілі на фронце культуры.

Вырвіч дзейнічае ў адкрытую. Ён прыкідваецца дурненькім: на яго, быццам, усе маюць падазрэнне, і на гэтым ён хоча адыграцца. Спачатку ён шкодзіць, не абдумваючы сваіх учынкаў, а потым ворагі выкарыстоўваюць яго ў сваіх мэтах.

Некалькі ў іншым плане выпісаны вобразы Французэвіча і Міколы. Французэвіч — трацкіст, і дзейнічае ён даволі замаскіравана. Міколу-ж ворагі скарыстоўваюць як маральна разлажыўшагася чалавека. Гэтыя два персанажы менш яркія, роля іх у п'есе не такая ўжо вялікая. Але дзейнічаюць і яны своеасабліва.

Усе ворагі групіруюцца вакол Харкевіча. Ён перадае ім заданні ад шпіёна Шабінскага, яны іх выконваюць. Аўтар вуснамі Язэпа надзвычай добра характарызуе гэтых нягоднікаў: «Ваша мосць, сабача косць!» Усіх іх аб'ядноўвае яшчэ тое, што панічнасць і страх перад савецкім народам не пакідае іх на працягу ўсёй п'есы. Яны ведаюць сілу народа, сілу бальшэвіцкай партыі, якая ўвасабляе думы і спадзяванні народныя, натхняе народ на вялікія перамогі сацыялізма, вядзе яго к светламу будучаму, к комунізму. Супроць такой сілы зграя груганняў устаяць не можа.

Зусім правільна робіць аўтар, калі з асяроддзя калгасных мас, партыйных кіраўнікоў, пагранічнікаў і вясковай інтэлігенцыі не вылучае асобных герояў, а бярэ звычайных савецкіх людзей, сапраўдных патрыётаў нашай краіны, і паказвае, як яны адзіным маналітным калектывам выкрываюць ворагаў, свята ахоўваюць непрыступныя межы Савецкага Саюза і паляпшаюць работу калгаса. Драматургічна ўсё гэта добра апраўдана і арганічна ўведзена ў сюжэт

Звернемся да групы старэйшых калгаснікаў. У гэтых персанажах сканцэнтравана і абагулена народная мудрасць. Мірон і Язэп, Рабічка і дзед Анісім — гэта чэсныя і адданыя сваёй справе працаўнікі. Яны робяць агульную справу—ліквідуюць ворагаў, умацоўваюць калгас. Яны рады заможнаму жыццю, якое здабылі калектыўнай працай дзякуючы геніяльнай палітыцы комуністычнай партыі і бацькоўскім клопатам правадыра народаў таварыша Сталіна.

Вобраз радавога калгасніка Мірона паказан аўтарам праўдзіва і выразна. Ён, стары калгаснік, добра ведае сваю справу, упэўнен у сілах калгаснікаў, цэніць іх працу, даверліва адносіцца да чэсных і працалюбівых людзей. Разам з тым ён добра адчувае і разумее тых людзей, якія лічацца членамі калгаса, але нічога агульнага з ім не маюць. У абрысоўцы Мірона, як і ў паказе астатніх савецкіх людзей, адчуваецца, што аўтар добра ведае тое асяроддзе, аб якім піша. Настойлівасць і ўпэўненасць — характэрныя рысы Мірона, якія надаюць вобразу некаторую тыповасць чалавека савецкай вёскі. Палітычная свядомасць Мірона сведчыць аб яго разумовых здольнасцях, аб яго светапоглядзе.

Рысы народнага гумару, якія ёсць і ў Мірона, больш за ўсё развіты ў вобразе Язэпа. Абаяльны гумар Язэпа асабліва ў сцэне гутаркі з Міронам, калі яны будуюць святочную арку, падкрэслівае жыццёрадаснасць вясковага чалавека, які толькі пры Савецкай уладзе адчуў сябе сапраўдным гаспадаром сваёй працы, гаспадаром зямлі, аддадзенай дзяржавай на вечнае карыстанне калгасам.

Вобраз Лук'яна Рабічкі, чалавека клапатлівага і адданага справе вырошчвання коней, паказан аўтарам задушэўна і пераканаўча. Такога чалавека любіш і спачуваеш яму.

Надзвычай цікавая фігура рыбака дзеда Анісіма, які клапоціцца аб тым, каб пачаставаць калгаснікаў сомам уласнага ўлову. Гэты бытавы персанаж упрыгожвае п'есу, уносіць у твор свежыя адценні, надае яму больш цеплыні і сакавітасці.

Быт калгаснікаў аўтар ведае дасканала. Гэта можна прасачыць і на мове, якая, дарэчы, у кожнага з персанажаў мае свае асаблівасці, і на радзе эпізодаў, якія захапляюць і палоняць чытача, заахвочваючы яго прачытаць п'есу некалькі разоў. Бытавыя сцэны, якія адбываюцца паміж Данілам і Сцепанідай, не толькі смешныя, але і надзвычай змястоўныя. Яны адлюстроўваюць новыя адносіны ў вёсцы паміж мужам і жонкай—членамі калгаса. Праз сварку паказваецца любоў гэтых людзей да калгаснай гаспадаркі. Такая мастацкая дэталь: каго зарэзаць — індыкоў ці бычка, і спрэчка вакол гэтага факта — красамоўны паказ адносін Данілы і Сцепаніды да грамадскай уласнасці, да жывёлы і птушак, якія ўзрошчаны імі. Праз гэтыя-ж вобразы паказан і культурны рост нашай вёскі. Запамінаецца сцэна, калі Даніла вучыць Сцепаніду спяваць. Сцепаніда спявае слаба, але хоча развіць свае здольнасці ў гэтай галіне мастацтва, бо яна зараз — роўнапраўны чалавек.

Мы бачым, што вобразы калгаснікаў напісаны аўтарам поўнакроўна, праўдзіва, своеасабліва і разнастайна. Кожны вобраз ад пачатку і да канца п'есы па-мастацку дасканала выяўлен і раскрыт у дзеянні і можа служыць узорам таго, як трэба ствараць вобразы савецкіх людзей.

Разумны сакратар райкома Дабрынін, які, як і лейтэнант Усенка, даволі ўмела выкрывае ворагаў. Але як добра-б было, калі-б мы часцей сустракаліся з імі ў п'есе, каб яны яшчэ больш зрадніліся з дзеючымі асобамі твора. Яны робяць вялікую справу і гэта ў п'есе адчуваецца, але іх характары недастаткова поўна раскрыты, іх чалавечыя асаблівасці не ярка акрэслены драматургам. Патэнцыяльныя магчымасці гэтых людзей значна большыя, чым гэта паказана ў п'есе. Адчуваецца некаторая залішняя публіцыстычнасць іх. Праўда, гэта ў канцы п'есы, дзе ўсё можна апраўдаць тым, што Дабрынін і Усенка выступаюць у якасці аратараў. Але гэта — лінія найменшага супраціўлення. Усё-ж нават і ў такім выглядзе фінал п'есы выклікае глыбокія патрыятычныя пачуцці.

Лінія Насці і Харкевіча носіць у п'есе пабочны характар, але мае вельмі вялікае значэнне. Ва ўзаемаадносінах бацькі і дачкі наглядна паказана барацьба двух пакаленняў — старога і маладога. Як ва ўсёй п'есе, так і ў гэтай сітуацыі перамагае савецкі чалавек. Насця выкрывае бацьку, бо інтарэсы савецкага чалавека ёй вышэй за сваяцкія пачуцці.

Драматургічна п'еса зроблена добра, падзеі разгортваюцца паслядоўна і арыгінальна. Характары асноўных персанажаў напісаны па-мастацку разнастайна. Мова ў кожнага персанажа свая — блізкая, народная мова сучасных савецкіх сялян. Аўтар вырашае тэму смела і цікава. Усё гэта надае п'есе пэўную мастацкую вартасць. Гэта — першая п'еса аб жыцці сёнешняга прыгранічнага калгаса, якая кладзе пачатак правільнаму, глыбокаму і ўсебаковаму раскрыццю рэчаіснасці сучаснай вёскі. Вялікі ўклад зроблен Эд. Самуйлёнкам у беларускую літаратуру. Як-бы многа мог зрабіць гэты чалавек для нашай савецкай літаратуры! Але тое, што не паспеў зрабіць гэты выдатны пісьменнік, будзе зроблена нашымі старэйшымі і маладымі паэтамі, празаікамі і драматургамі, якія праслаўляць эпоху сацыялізма ў сваіх творах.

П'еса «Пагібель воўка» упрыгожыць сцэны не толькі тэатраў БССР, якія зараз працуюць над ёю, — яна ўвойдзе ў залаты фонд рэпертуару тэатраў усіх народаў Савецкага Саюза. Гэта п'еса будзе паказана на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Мы спадзяемся, што ў хуткім часе яе паставяць і лепшыя тэатры чырвонай сталіцы.

* Журнал «Полымя рэвалюцыі» № 1, 1939

100 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. П. МУСОРГСКАГА

КЛАСІК РУСКАЙ МУЗЫКІ

Совецкая грамадскасць шырока адзначае памятную дату — стагоддзе з дня нараджэння Мадэста Пятровіча Мусоргскага. Творчасць гэтага класіка рускай музыкі шматлікімі і жывымі ніцямі звязана з совецкай музычнай культурай. Творы Мусоргскага, у якіх адлюстравана вялікая праўда аб народным жыцці, нязменна сустракаюць у нас гарачы водгук і глыбокае разуменне.

М. П. Мусоргскі нарадзіўся 28 сакавіка 1839 года ў вёсцы Карэва, Таропецкага павета, Пскоўскай губерніі. Уражанні дзяцінства, звязаныя з цудоўнай рускай прыродай, з жыццём сялянства, з яго песнямі і паэтычнымі казкамі, наклалі адбітак на ўвесь творчы шлях Мусоргскага, вызначылі глыбокую цікавасць кампазітара да сапраўднага жыцця рускага народа і яго гісторыі.

Ужо ў раннім маленстве выявіліся вялікія музычныя здольнасці Мусоргскага. У 1849 годзе ён прыехаў у Пецярбург, дзе адначасова з навучаннем у школе падпрапаршчыкаў пачаліся яго сур'ёзныя заняткі музыкай. Да моманту сканчэння школы ў Мусоргскага мацнее вера ў сваё музычнае прызванне, і ён хутка адмаўляецца ад кар'еры афіцэра.

Да гэта-ж часу адносіцца збліжэнне Мусоргскага з выдатнымі рускімі кампазітарамі — Балакірэвым, Кюі, Барадзіным, пазней — з Рымскім-Корсакавым, а таксама са славутым крытыкам В. Стасавым. Дзейнасць гэтага гуртка, які хутка вылучыўся на грамадскай арэне пад назвай «магутнай кучкі», цесна звязана з перадавымі грамадскімі ідэямі 60-х год. Рэалізм, глыбокая ідэйнасць, служэнне народу — вось тыя падваліны, на якіх трымалася перадавое мастацтва гэтай эпохі, якое пакінула вялікі след у рускім культурным жыцці.

К сярэдзіне 60-х год Мусоргскі знаходзіць свой яркі, глыбока своеасаблівы стыль. Пачынаецца цудоўная творчая спеласць кампазітара. Ён стварае творы надзвычайна жывыя, смелыя, сапраўды нацыянальныя па ўсяму свайму строю.

З гэтай серыі першай па часу з'явілася песня «Калістратушка» (1864 год), напісаная на словы Некрасава. Да яе прымыкае рад музычных карцін, у якіх геній Мусоргскага адлюстраваў трагічныя вобразы сялянскага гора, безвыходнай беднасці («Спі, засні, сялянскі сын», «Сіротка», «Свецік Савішна» і інш.). А побач — песні, поўныя цёплай, яснай лірыкі, задушэўнай чыстаты («Па-над Донам сад цвіце»).

У гэты-ж час расцвітае сатырычны геній Мусоргскага. У такіх песнях, як «Семінарыст» (першы музычны твор Мусоргскага, забаронены цэнзурай) і «Казёл», кампазітар бязлітасна высмеяў уродствы і цёмныя бакі сучаснага яму грамадства.

Улетку 1868 года Мусоргскі ажыццявіў цікавы вопыт —музычнае ўвасабленне гогалеўскай камедыі «Жаніцьба». Восенню таго-ж года Мусоргскі ўжо быў заняты новай вялікай работай — ён прыступіў да стварэння народна-гістарычнай оперы «Барыс Гадуноў» паводле драмы Пушкіна.

Асабліва ярка ў «Барысе Гадунове» паказан народ. Народ — галоўная дзеючая сіла, на якой заснавана ўсё драматычнае развіццё оперы. Для абмалёўкі народных пачуццяў, перажыванняў, для паказу руху мас Мусоргскі знаходзіць музычныя вобразы, якія захапляюць сваёй велічнасцю і дасканаласцю.

Гарачая любоў да народа, спачуванне яго пакутам, захапленне перад яго здаровым гумарам і невычэрпнай, вялікай «сілай-сілушкай» — вось тыя благародныя пачуцці, якімі насычаны выдатныя народныя сцэны «Барыса Гадунова».

Перадавыя слаі рускага грамадства віталі «Барыса Гадунова» як новае магутнае слова, як цэлую эпоху ў гісторыі музычнага тэатра.

Інакш сустрэлі «Барыса Гадунова» «власть имущие» — царскія музычныя чыноўнікі. Двойчы забракаваная, опера была пастаўлена ў 1874 годзе толькі дзякуючы выпадковасці. Хутка-ж пачаліся ўрэзкі, скарачэнні, і, нарэшце, «крамольная» опера была на доўгія годы знята з рэпертуару, не гледзячы на яе велізарны поспех.

Годы работы над «Барысам Гадуновым» былі найбольш шчаслівым і плённым перыядам у жыцці і творчасці Мусоргскага. У гэты час ён стварае такія геніяльныя творы, як цыкл песень «Дзіцячая», «Раёк», выдатныя па навізне і багаццю вобразаў фортэп'янныя «Карцінкі з выстаўкі» і інш. Ён замышляе таксама новую манументальную работу — гістарычную оперу «Хаваншчына».



М. П. Мусоргскі.
Партрэт работы І. Рэпіна.

У сярэдзіне 70-х год у жыцці і творчасці Мусоргскага адбываецца пералом. На ўражлівага кампазітара не маглі не мець уплыву цкаванне і праследванні оперы «Барыс Гадуноў». Да гэтага-ж часу адносіцца распад «магутнай кучкі», успрыняты Мусоргскім надзвычай хваравіта. У творах Мусоргскага сталі мільгаць матывы беспрасветнай роспачы (цыклы «Без сонца», «Песні і пляскі смерці»— вакальныя творы, поўныя патрасаючага драматызму).

У такой атмасферы стваралася «Хаваншчына» — геніяльнае прадоўжанне ідэй і вобразаў «Барыса Гадунова». Маладосць Пятра І, барацьба старай і новай Расіі пятроўскага часу, сутыкненне розных сацыяльных сіл — на такім складаным гістарычным фоне развіваецца сюжэт «Хаваншчыны».

Адначасова з «Хаваншчынай» Мусоргскі пісаў оперу «Сарачынскі ярмарак» па аповесці Гогаля. Нешматлікія сцэны, якія ён паспеў закончыць, вызначаюцца ясным, сонечным каларытам, жывым камізмам, найцяснейшай сувяззю з украінскай народнай музыкай. «Сарачынскі ярмарак» — яркая супрацьлегласць тым трагічным адчуванням, якімі былі поўны апошнія годы жыцця Мусоргскага.

Бязладнае, адзінокае жыццё без сяброў, без сям'і падточыла арганізм Мусоргскага. У пачатку 1881 года ён цяжка захварэў і быў накіраван у Нікалаеўскі ваенны шпіталь. Для таго, каб мець права на лячэнне, Мусоргскі быў запісан у шпіталі пад выглядам вольнанаёмнага дзеншчыка ўрача Бертэнсона. Гэта была апошняя знявага, якой царская Расія падвергнула геніяльнага кампазітара. 28 сакавіка 1881 года аўтара «Барыса Гадунова» і «Хаваншчыны» не стала.

Сапраўднае прызнанне Мусоргскага наступіла пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Упершыню былі выданы ўсе творы Мусоргскага ў іх сапраўдным, нескажоным выглядзе. Совецкі народ любіць і беражліва ахоўвае геніяльную спадчыну Мусоргскага.

А. ШАВЕРДЗЯН.

МУСОРГСКІ—ЛІТАРАТАР

Геніяльны рускі кампазітар М. П. Мусоргскі, стогадовы юбілей з дня нараджэння якога зараз адзначае ўся совецкая грамадскасць, быў не толькі найвялікшым музыкантам, але і найцікавейшым дзеячом у галіне літаратуры.

Мусоргскі з цікавасцю перакладае нямецкага філасофа Лафатэра, спачувальна адносіцца да матэрыялістычных філасофскіх прац Гольбаха. Мусоргскі мае вялікую асалоду, па яго выразу, чытаючы Дарвіна, захапляецца раманам Герцэна «Хто вінават».

Мусоргскі наладжвае моцныя сувязі з такімі пісьменнікамі, як Тургенеў, Грыгаровіч, Пісемскі, Шаўчэнка.

Літаратурная схільнасць аказвае велізарны ўплыў на музычную творчасць Мусоргскага. Дастаткова назваць такіх аўтароў тэкстаў твораў Мусоргскага, як Пушкін, Лермантаў, Некрасаў, Шаўчэнка, Гогаль, Гётэ, Гейнэ, Флабер, Байран, каб меркаваць аб сур'ёзнасці і мастацкім гусце Мусоргскага і яго цягаценні да лепшых узораў літаратуры.

Перадавы чалавек свайго часу, паслядоўна праводзіўшы ў мастацтве прагрэсіўныя прынцыпы грамадскага ўздыму 60-х год, Мусоргскі быў змагаром за народнасць, за рэалізм, за мастацкую праўду. «Адна думка... сказаць людзям новае слова дружбы і любві, прамое і ва ўсю шырыню рускіх палян, праўдай гучачае слова...» — гаворыць ён.

Дух народнага жыцця быў галоўным імпульсам Мусоргскага. У сваіх першых рамансах і песнях Мусоргскі спрабуе сябе і як аўтар тэкстаў на народныя сюжэты (песні «Свецік Савішна», «Азорнік», «Сіротка»). Ён піша і тэксты песень, накшталт:

Ах ты, дубрава-дубравушка,
Мати дубрава зеленая,
Что шумишь-надрываешься,
Словно ждешь бурю-непогодь...

Гэты тэкст Мусоргскага ўвайшоў у оперу «Пскавіцянка» Рымскага-Корсакава.

Здольнасці Мусоргскага развіваюцца на практычнай рабоце і асабліва праяўляюцца ў плане сатыры. І тэкст і музыка такіх вядомых рэчаў Мусоргскага, як «Класік», «Семінарыст», «Казёл», «Раёк», напісаны самім Мусоргскім. У «Райку» Мусоргскі высмейвае коснасць, руціну і вузасць музычных заправілаў таго часу.

Ствараючы музычную народную драму «Барыс Гадуноў» на сюжэт Пушкіна, Мусоргскі піша для яе рад новых эпізодаў, сцэн, а да «Хаваншчыны» ён сам поўнасцю піша лібрэта на аснове вывучэння гістарычных матэрыялаў. У гэтым лібрэта з найвялікшай сілай выяўляецца літаратурнае дараванне Мусоргскага.

Мусоргскі любіў апранацца ў літаратурныя грымы, выступаючы пад маскай выдуманага ім персанажа «Савішны», пад абліччам дзяка, пад вобразам свенкага гвардзейца і г. д., што выяўляла безумоўны ўплыў Козьмы Пруткова (бр. Жэмчужнікавы былі блізкімі кругу знаёмстваў Мусоргскага). Асабліва даставалася ад Мусоргскага кансерватыўным музычным вяльможам, рускаму музычнаму грамадству і Кансерваторыі, якія былі тады пад апекай в. кн. Елены Паўлаўны.

В. В. Стасаў, друг і лепшы біёграф Мусоргскага, шмат разоў сведчыў, што з усіх рускіх кампазітараў Мусоргскі асабліва адрозніваўся цікаўнасцю, начытанасцю ў самых разнастайных галінах ведаў і найбольш у літаратуры.

Мусоргскі таленавіта спалучае ў сабе і геніяльнага музыканта і цікавага літаратурнага дзеяча, які рухаў наперад мастацтва сваёй эпохі, мыслі якога не страцілі свайго значэння і ў наш час.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

ДРУГАЯ СІМФОНІЯ Н. Н. ШЧЭГЛОВА

Уздым музычнай культуры БССР азнаменаваўся паяўленнем раду твораў буйных форм. Кампазітарамі БССР створаны такія манументальныя творы, як оперы «Міхась Падгорны» Цікоцкага і «Дрыгва» Багатырова, балет «Салавей» Крошнера, а таксама рад сімфоній Аладава, Падкавырава, Залатарова, Багатырова, Шчэглова і інш.

Асаблівую цікавасць выклікае другая сімфонія Шчэглова, якая была выканана 18 сакавіка Дзяржаўным сімфанічным аркестрам філармоніі БССР.

Сімфонія мае прадпасланую самім аўтарам праграму. 1-я частка сімфоніі ўяўляе асноўны лейтматыў, дзе расказваецца аб гісторыі беларускага народа, аб яго барацьбе, пакутах і перамозе. 2-я частка — гэта мінулае беларускага і яўрэйскага народаў, авеянае беспрасветным смуткам і горам. 3-я частка — фінал — малюе радаснае жыццё Чырвонай Беларусі. Спевы, пляскі, вясёлы смех чутны ў гэтай частцы. На фоне свята праходзіць водгук ваеннага марша, — ідуць часці Чырвонай Арміі. Потым зноў песні і пляскі беларускага народа, які радасна сустракае байцоў Чырвонай Арміі. Такі змест сімфоніі.

Сімфонія багата беларускімі народнымі мелодыямі, яна яркая, эмацыянальная, шчырая, адразу-ж захапляе слухача. Аднак, талент аўтара ў гэтай сімфоніі пасапраўднаму не раскрыт. Гэта тлумачыцца тым, што кампазітар празмеру траціць матэрыял, укладае ў работу значна больш, чым трэба, раскідвае багацці не шкадуючы. Распрацоўка асноўных тэм месцамі тоне ў гэтай разнастайнасці і багацці музычнага матэрыялу, які цудоўны сам па сабе, але загружае асноўны лейтматыў сімфоніі. З-за недастатковай лаканічнасці шмат страчвае і форма ў цэлым. Таму сімфонія больш падобна на вялікую сімфанічную паэму, якая мае к таму-ж поўную праграму. Адсюль і некаторая расцягнутасць (2-я частка), над ліквідаваннем якой аўтару неабходна яшчэ папрацаваць.

Аўтар выдатна валодае тэхнікай аркестра. Праўда, і ў галіне інструментоўкі, і ў галіне самой музычнай фактуры кампазітар знаходзіцца пад моцным уплывам лепшых прадстаўнікоў рускай музычнай культуры — Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Барадзіна. Але гэты ўплыў нікольні не пазбаўляе аўтара самастойнасці і арыгінальнасці ў яго творчасці.

Не гледзячы на некаторыя недахопы, сімфонія Шчэглова — з'ява надзвычай каштоўная для музычнай культуры БССР. Аўтар сімфоніі бясспрэчна таленавіты кампазітар і яму трэба пажадаць у далейшым яшчэ большага творчага росту.

У заключэнне неабходна адзначыць вялікую работу, праробленую аркестрам і дырыжорам праф. Мусіным.

Неабходна, каб сімфонія Шчэглова была паказана Філармоніяй у Маскве, Ленінградзе і іншых буйных гарадах Совецкага Саюза.

А. КЛУМАЎ,
дацэнт Кансерваторыі БССР.

АБМЕРКАВАННЕ ЗБОРНІКА ВЕРШАЎ П. СЛЕСАРАВА

24 сакавіка руская секцыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР абмяркоўвала зборнік вершаў, падрыхтаваны да друку чырвонаармейскім паэтам Паўлам Слесаравым.

М. Груб'яну спадабаліся бытавыя вершы паэта.

— У гэтых вершах, — гаворыць Груб'ян, — багата цёплага, чалавечага гумару. Адчуваецца арыгінальны голас паэта.

Тав. Астроўскаму падабаюцца абаронныя вершы П. Слесарава. У паэта цікавы стыль і своеасаблівая манера пісьма. Узяць, напрыклад, верш «Кулямётчыца». Паэт трымае чытача ў напружанні да апошняй страфы і толькі ў заключных радках умела паказвае, што за двума кулямётамі была ўсяго адна дзяўчына.

Аб тым, што П. Слесараў ідзе не па лініі логікі, а па лініі паказу вобразаў і дзеянняў праз дэталь, гаварыў тав. Бярозкін. Але вельмі часта паэт перагружае вершы бытавымі дэталямі, часам маладзначнымі, якія засланяюць асноўную думку твора. Не ўсе канцоўкі ў вершах удалыя. Да ліку лепшых вершаў П. Слесарава Бярозкін адносіць «Баладу пра хлебарэза», «Сэрца», «Гора», «Грузчыкі».

Тав. І. Гурэвіч гаварыў, што Слесараву слаба ўдаліся вершы на вытворчыя тэмы. Тав. Гурэвіч таксама адзначыў, што паэт не зусім эканомны ў паказе бытавых дэталей. Канцоўкі вершаў П. Слесарава гумарыстычныя, арыгінальныя, але не ва ўсіх вершах к месцу.

— Вершы П. Слесарава можна чытаць некалькі разоў і яны не надакучаць; але тут-жа хочацца асобныя радкі папраўляць, бо побач са зробленымі па-майстэрску радкамі трапляюцца радкі сырыя, падагнаныя штучна. Вядома, яны выбіваюцца з кантэкста, псуюць верш. Вершы П. Слесарава можна назваць паэтычнымі навеламі. У іх такія нечаканыя канцоўкі, што ніколі не ведаеш, чым аўтар закончыць свой верш, — адзначыў тав. М. Клімковіч.

Гаварыўшы, якія прысутнічалі на абмеркаванні, указалі тав. Слесараву на паасобныя шарахаватасці ў яго вершах, але ўсе сышліся на думцы, што П. Слесараў здольны, арыгінальны і своеасаблівы паэт.

Выданне зборніка вершаў чырвонаармейскага паэта Паўла Слесарава трэба вітаць.

Ан. АСТРЭЙКА.

Агульнагарадскі шэўчэнкаўскі вечар

27 сакавіка ў клубе імя Сталіна (Менск) рэспубліканскі шэўчэнкаўскі камітэт правёў агульнагарадскі вечар, прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння вялікага ўкраінскага кабзара, паэта-рэволюцыянера Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка.

З вялікай увагай праслухалі прысутныя даклад дырэктара інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР тав. Барысенка аб жыцці і творчасці бяссмертнага ўкраінскага песняра.

З вялікім уздымам, пад бурныя авацыі прысутных, прынят тэкст прывітальнага пісьма правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Урачыстая частка вечара закончылася чыткай твораў Шэўчэнка ў перакладзе на беларускую мову. Пераклады чыталі тт. К. Крапіва і М. Клімковіч. З чыткай твораў, прысвечаных памяці Шэўчэнка, выступілі народны паэт БССР ордэнаносец Якуб Колас, паэты С. Каган, Э. Агняцвет, М. Груб'ян.

З выкананнем твораў Шэўчэнка, перакладзеных на музыку беларускімі кампазітарамі Туранковым, Шчэгловым, Крошнерам, Падкавыравым і інш., выступілі заслужаныя артысты БССР тт. Аляксеева, Млодэк, Дзянісаў, артыст Тэатра оперы і балета тав. Капара і хор Дзяржаўнай філармоніі БССР.

К. Ц.

У САЮЗЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

На апошнім пасяджэнні праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР разгледжан новы зборнік навел і апавяданняў маладога празаіка Усевалада Краўчанкі, падрыхтаваны аўтарам да друку.

З паведамленнем аб творчасці Ус. Краўчанкі выступіў тав. Клімковіч. Выказаліся тт. Кандраценя, Крысько, Паслядовіч, Ільінскі, Аксельрод, Лынькоў.

Адзначыўшы разнастайную і цікавую тэматыку зборніка, свежасць мовы, уменне аўтара разбірацца ў складаных праявах калгаснага жыцця, удзельнікі нарады ўказалі тав. Краўчанку на рад істотных і сур'ёзных недахопаў у яго творчасці. Агульная думка ўсіх выступаўшых: калі тав. Краўчанка папрацуе яшчэ над сваімі творамі, чытач атрымае цікавы зборнік аб калгасным жыцці.

**

На гэтым-жа пасяджэнні разабрана заява маладога яўрэйскага паэта Л. Талалая аб прыёме яго ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. З паведамленнем аб творчасці тав. Талалая выступіў тав. Камянецкі, выказаліся т.т. Пялесін, Бярозкін, Аксельрод, Ліўшыц. Усе яны адзначылі, што тав. Талалай з'яўляецца арыгінальным і таленавітым паэтам, вершы яго прасякнуты цеплынёй, глыбокім лірызмам, шчырасцю пачуццяў і думак. Асабліва ўдаюцца Талалаю вершы аб калгаснай вёсцы, аб людзях і справах Чырвонай Арміі.

Праўленне аднагалосна пастанавіла прыняць тав. Талалая ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Я. Г.

ПАПРАЎКА

У перадавым артыкуле нашай газеты ад 23 кастрычніка 1938 года літкансультанты габінета пачынаючага аўтара пры ССП БССР абвінавачваліся ў тым, што яны не займаюцца з таварышамі, якія пішуць свае творы на рускай мове, а накіроўваюць іх у рэдакцыі газет «Советская Белоруссия» і «Сталинская молодежь».

Як высветлена, габінет даваў і дае кансультацыю таварышам, якія пішуць на рускай, яўрэйскай і ўкраінскай мовах, у прыватнасці на рускай мове аргумоўваюць кансультацыю тт. Ліскавіцін, Зубец, Цысленка, Марсаў, Юр'еў, Гузарэвіч, Казлоў і інш. У рэдакцыі газет «Советская Белоруссия» і «Сталинская молодежь» габінет перасылаў толькі пракансультыраваныя і выпраўленыя аўтарамі творы пачынаючых, вартыя надрукавання, што зусім правільна.

Гэтым рэдакцыя выпраўляе сваю памылку.

„ПАДЗЬ СЯРЭБРАНАЯ“

П'еса Н. Пагодзіна «Падзь Сярэбраная», адзін з актуальнейшых драматургічных твораў сучаснага моманту, з'яўляецца надзвычай злабадзённым матэрыялам для сцэны совецкага тэатра. Калі п'еса фабульна некалькі і рыхлая, то сіла яе, у процівагу гэтаму, у праўдзівай абрысоўцы пагранічнага эпізода, у правільна выпісаных вобразах людзей гераічнай пагранічнай аховы вялікай радзімы соцыялізма. Пасля хасанаўскіх падзей і ў напружанай міжнароднай абстаноўцы бягучага моманту выхаваўчая сіла п'есы павялічваецца ўдвая.

Адказваючы на законныя патрабаванні сталічнай грамадскасці, Менскі Дзяржаўны драматычны тэатр БССР правільна зрабіў, уключыўшы «Падзь Сярэбраную» у свой рэпертуар і аддаўшы яе пастаноўцы сур'ёзную ўвагу. Радуе і тое, што ў спектаклі прымае ўдзел, галоўным чынам, моладзь.

Пастаноўка «Падзі Сярэбранай» (пастаноўшчык — засл. арт. рэсп. Л. Рахленка) у сваёй аснове зроблена праўдзіва, рэалістычна, з веданнем матэрыялу і абстаноўкі, смела і пераканаўча. Пазбягаючы штампаў і трафарэтаў ходавых п'ес, адыходзячы ад уплыву адстаяўшыхся вобразаў, рэжысура дапамагла большасці выканаўцаў спектакля стварыць арыгінальныя, пераканаўчыя вобразы.

На фоне ўсяго спектакля чырвонаармейскія карціны — самыя лепшыя. Адчуваецца, што калектыў і пастаноўшчыкі любоўна аднесліся да працы, сур'ёзна і па-дзелавому падышлі да пастаноўкі «Падзі Сярэбранай», як надзвычай адказнага спектакля.

Артыст Кудраўцаў стварыў вобраз рашучага па характару, смелага камандзіра пагранічнікаў — начальніка заставы Чэркасава. Чэркасаў выведзен Кудраўцавым разумным, адданым радзіме пагранічнікам, іменна такім, якім уяўляе яго совецкая грамадскасць, народ нашай радзімы.

Скромна, стрымана, але выпукла сыграна актрам Глікманам роля лейтэнанта Бахмецьева. Праўда, і ў таго, і ў другога выканаўцы адчуваецца нязначнае «пераігрыванне», у прыватнасці — залішняе шчоўканне шпорамі, неўласцівае ў такой утрыраванай ступені каманднаму складу Чырвонай Арміі.

Добра падабран акторскі склад для выканання ролей байцоў-пагранічнікаў. Кожны баец (Кулькоў, Салонкін, Шатроў, Мансураў, Касценка, Цыгарын, Кудзяраў) мае рысы, адрозніваючыя іх адзін ад другога. Гэта не проста «маса», а выканаўцы першарадных ролей. Добра, у стрыманым тэмпераменце, які часам прабіваецца знешне, зрабіў артыст Аляксеенка Азіса Мансурава. Шатроў у выкананні Б. Янпольскага з яго падкупляючай прастатой і зацейнай выдумлівасцю — любімы персанаж публікі. Актор Пекур у сваёй камічнай прастаце авалодвае вялікай увагай гледача.

Дыверсант Дзевяткін, былы есаул Уссурыйскага войска, у выкананні артыста Краўцова абрысаван надзвычай арыгінальна, у «арамаце» сапраўднага ворага-белагвардзейца, купленага самураямі і кінутага японскім мілітарызмам для шкодніцтва на совецкую тэрыторыю. Гэта — тыповы вобраз ворага, і ён выклікае нянавісць да сябе ў публікі.

З японскай групы персанажаў найбольш вылучаецца японскі салдат (артыст Струсевіч). Акцэнт, рухі, манеры прымушаюць бачыць перад сабою тыповага, забітага, са спустошанай душой і забітымі пачуццямі, салдата імперыялістычнай Японіі.

Цікава і пераканаўча падалі ролі японскіх афіцэраў артысты Бараноўскі і Былінскі.

Калі артыстцы Станюта ў ролі баявой падругі камандзіра — Соф'і Андрэеўны ўдалося знайсці ў памяркоўна-драматычных тонах вобраз гарачай патрыёткі сваёй радзімы, то роля Тані артысткі Браварскай не зусім удалася. Магчыма, з-за недапрацаванасці ролі вобраз не пераконвае ў самым галоўным — у шчырасці. Ён вельмі спрошчаны.

Мастацкае афармленне (мастак Б. Малкін) трэба лічыць не зусім удалым. Дэкарацыі (лес) хоць і перагружаны «суровай» прыродай і «мастацкімі ўдзікасці» віламі, але не пераконваюць, што гэта Далёкі Усход. Не адчуваеш, як гаворыцца, «дыхання краю». Мастак не выкарыстаў перспектывы ці панарамы краявіду Далёкаўсходняга краю ў іх спецыфічна-відавых асаблівасцях.

Бадзёрай, жыццёрадаснай карцінай закончан спектакль. Глядач выходзіць з пераконаннем, што граніца ў надзейных руках. Глядач пераконан у гэтым наогул, але пераконанне гэта тэатр пацвердзіў і вобразна.

Спектакль «Падзь Сярэбраная» — безумоўна ўдача тэатра і гордасць маладзёжнай часткі акторскага калектыва.

Улад. МУРАТ.



«Падзь Сярэбраная» Н. Пагодзіна ў Менскім Белдзярждрамтэатры. Арт. Браварская ў ролі Тані, арт. Кудраўцаў у ролі Чэркасава. Фота І. Каплінскага.



Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР паставіў балет «Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева паводле паэмы А. С. Пушкіна. Пастаноўшчык К. Я. Галейзоўскі. На здымку: засл. арт. БССР А. В. Нікалаева ў ролі Зарэмы.

Фота І. Каплінскага.

БАЛЕТ „ЛАУРЭНСІЯ“

У канцы сакавіка ў Ленінградскім ордэна Леніна Акадэмічным Тэатры оперы і балета імя С. М. Кірава адбылася прэм'ера балета «Лаурэнсія», напісанага па матывах вядомай п'есы Лопе дэ Вега «Авечая крыніца». Аўтары балета — лібрэтыст Я. М. Мандэльберг і заслужаны дзеяч мастацтваў кампазітар А. А. Крэйн. Ставіў спектакль балетмейстар — ордэнаносец Вахтанг Чабукіяні. Прэм'ера мела вялікі і заслужаны поспех.

Спектакль пастаўлен тэатрам у гонар XVIII з'езда ВКП(б). У гутарцы з нашым карэспандэнтам заслужаны дзеяч мастацтваў кампазітар Аляксандр Крэйн заявіў:

— Работа з выдатным калектывам Тэатра оперы і балета імя С. М. Кірава надзвычай узбагаціла мяне. «Лаурэнсія» стваралася ў цесным садружастве з тэатрам і асабліва з выдатным майстрам, двойчы ордэнаносцам — Вахтангам Чабукіяні. Незадоўга да прэм'еры прышла радасная вестка аб узнагароджанні тэатра ордэнам Леніна і раду артыстаў — ордэнамі Саюза ССР і ганаровымі званнямі. Высокая ўзнагарода ўрада акрыліла калектыў і работа над «Лаурэнсіяй» была закончана сапраўды ўдарнымі тэмпамі.

А. МАІСЕЕЎ.

Ленінград (Наш кар.).

САМАДЗЕЙНЫ СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР

30 сакавіка адбыліся першыя заняткі самадзейнага сімфанічнага аркестра, арганізаванага пры Доме народнай творчасці БССР. Кіруе заняткамі заслужаны артыст рэспублікі А. Л. Бяссмертны.

Аркестр налічвае 32 чалавекі. У дружны музычны калектыў аб'ядналіся доктар Шабад, строгаль завода «Большэвік» Бенгіс, хатняя гаспадыня Гінзбург, педагогі С. А. і В. М. Гурыновічы, рабочы дражджавога завода «Пролетарый» Дрэйслер, бухгалтар Стрыго і іншыя. У калектыве прадстаўлена амаль столькі-ж прафесій, колькі ў ім налічваецца ўдзельнікаў. Такая-ж разнастайнасць ва ўзросным складзе аркестра — ад 12 да 57 год. Усё гэта, аднак, не перашкаджае дружнай рабоце, бо жаданне вучыцца ва ўсіх удзельнікаў аркестра велізарнае.

Аркестр узяў на сябе абавязацельства 1 Мая паказаць працоўным Менска сваю першую праграму.

ХРОНІКА

◆ У бліжэйшыя дні ў Доме мастака (Менск) адкрыецца выстаўка старарускай і совецкай графікі, арганізаваная Музеем выяўленчых мастацтваў імя Пушкіна ў Маскве.

◆ Барысаўскі калгасна - соўгасны тэатр пераведзен на пастаянную работу ў Заслаўльскі раён.

◆ Для азнаямлення з выстаўкамі «Індустрыя соцыялізма», «20 год ВЛКСМ», «Ленін і Сталін у народна-выяўленчым мастацтве» і выстаўкай гістарычнага жывапісу ў Маскву выехалі 24 мастакі і скульптары БССР. У бліжэйшыя дні ў Маскву для гэтай-жа мэты выязджае другая група мастакоў з 20 чалавек.

◆ 25 сакавіка адбыўся адкрыты паказальны канцэрт студэнтаў духавой кафедры Дзяржаўнай кансерваторыі БССР. Упершыню духавая кафедра дала тэматычны канцэрт з твораў Моцарта.

◆ У тэатральным вучылішчы БССР пачаліся заняткі на аднагадовых курсах па падрыхтоўцы актораў для калгасна-соўгасных тэатраў. На курсах навучаецца 28 чалавек.

◆ У дваццатых чыслах красавіка ансамбль песні і пляскі Дзяржаўнай філармоніі БССР выязджае на гастролі ў Узбекскую ССР. Ансамбль наведае Ташкент, Фергану, Самарканд і іншыя гарады. У рэпертуары ансамбля—узбекская песня аб бавоўне, запісаная ў народнай артысткі УзССР ордэнаноса Тамары Ханум.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела К—1001.